ШТО АДБЫВАЕЦЦА НА ГРАНІЦЫ? 7

«ПАЛАЧАНКА» Ў НОВЫМ УВАСАБЛЕННІ 8

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

16 ЛІСТАПАДА 2024 г. СУБОТА

№ 224 (30358)

ЗВЯЗДА

Магілёўшчына святкуе «Дажынкі»

Сёння, 16 лістапада, у Клімавічах праходзіць абласны фестываль-кірмаш працаўнікоў вёскі «Дажынкі-2024». Райцэнтр старанна падрыхтаваўся да сустрэчы з удзельнікамі і гасцямі свята. Асноўныя падзеі разгортваюцца ў цэнтральнай частцы горада, дзе звычайна шуміць міжнародны дзіцячы фестываль «Залатая пчолка». Гэтым разам тут сустракаюць гасцінныя падворкі і пляцоўкі фестывалю-кірмашу.

Урачыстае ўшанаванне аграрыяў адбываецца на абноўленай Фестывальнай плошчы каля раённага цэнтра культуры. Святочны бляск набыў і сам цэнтр культуры. Будынак, узведзены ў канцы 50-х у стылі сталінскага ампіру, пасля рэканструкцыі стаў больш сучасным і функцыянальным. Глядзельная зала на 205 пасадачных месцаў аснашчана найноўшым гукаўзмацняльным і светлавым абсталяваннем, установлены святлодыёдны экран. У цэнтры культуры створаны ўсе ўмовы для рэалізацыі розных культурных і грамадскіх праектаў.

Адрас яшчэ адной важнай падзеі свята — цырымонія ўзнагароджання пераможцаў абласных спаборніцтваў за дасягненне высокіх паказчыкаў на ўборцы ўраджаю збожжавых і зернебабовых — Клімавіцкі аграрны каледж. Установа рыхтуе запатрабаваных спецыялістаў па рамонце і абслугоўванні сельскагаспадарчай тэхнікі. Прафесію тут набываюць 470 чалавек. Падчас падрыхтоўкі да «Дажынак» зроблены рамонт грамадска-бытавога корпуса каледжа з установкай сучаснага абсталявання. Навучэнцы прымалі актыўны ўдзел у добраўпарадкаванні тэрыторыі сваёй прафесійна-тэхнічнай навучальнай установы.

Да свята адноўлены знакаміты тутэйшы будынак — помнік драўлянага дойлідства XIX стагоддзя — асабняк князёў Мяшчэрскіх. Тут размешчаны экспазіцыі раённага краязнаўчага музея. Пасля рэканструкцыі ў будынку адкрыліся новыя экспазіцыйныя залы, прысвечаныя прыродзе, археалогіі, этнаграфіі, гісторыі краю і яго сучаснасці, а таксама выставачная зала.

У гарадскім парку Народнага адзінства абноўлены пешаходныя дарожкі, амфітэатр, дзіцячая гульнявая пляцоўка, установлены новыя лаўкі. Сцэна амфітэатра сёння — месца некалькіх канцэртаў для наведвальнікаў свята працаўнікоў сяла. Вечарам канцэртнае жыццё перамесціцца на пляцоўку каля цэнтра культуры. У канцэртнай праграме «Спевы роднай зямлі» выступяць беларускія і расійскія артысты — Жанет, Сяргей Славянскі, сёстры Груздзевы, ансамбль народнай музыкі Бранскай абласной філармоніі «Ватага», салісты Магілёўскай абласной філармоніі.

Як заўсёды, на свяце шмат цікавых лакацый і забаў. Гасцінна запрашаюць да сябе гандлёвыя рады і тэматычныя пляцоўкі, шмат цікавага, смачнага і карыснага прапануе выстава-кірмаш. Сувенірамі і іншымі вырабамі ўласнай вытворчасці радуюць установы сярэдняй спецыяльнай адукацыі. А ратавальнікі і супрацоўнікі міліцыі выступаюць з паказальнымі праграмамі і прапаноўваюць азнаёміцца з прадметамі спецамуніцыі і прафесійнай тэхнікі.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

СВЯТА САПРАЎДНЫХ ПАТРЫЁТАЎ

Работнікам і ветэранам сельскай гаспадаркі і перапрацоўчай прамысловасці агрmaпрамысловага комплексу

Дарагія сябры!

Прыміце самыя шчырыя віншаванні з прафесійным святам — Днём работнікаў сельскай гаспадаркі і перапрацоўчай прамысловасці агрaпрамысловага комплексу.

Сёння сельскагаспадарчая галіна краіны ўваходзіць у лік найбольш эфектыўных у беларускай эканоміцы.

Нашы працаўнікі сельскай нівы сёлета вырасцілі і сабралі добры ўраджай: больш чым дзесяць мільёнаў тон збожжа з улікам кукурузы і рапсу, каля пяці мільёнаў тон цукровых буракоў. Аграрыі забяспечваюць якаснымі і смачнымі прадуктамі ўласнае насельніцтва, працягваюць нарошчваць экспарт.

Перакананы, што дзякуючы вашай працавітасці і ўпартасці будуць годна выкананы маштабныя задачы, якія стаяць перад АПК краіны.

Выказваю словы ўдзячнасці ветэранам галіны і ўсім вяскоўцам за прафесіяналізм і адказнасць, шчырую любоў да роднай зямлі, імкненне захоўваць і прымнажаць найлепшыя нацыянальныя аграрныя традыцыі.

Жадаю кожнаму з вас моцнага здароўя, дабрабыту і стабільна высокіх ураджаяў.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

Фота БелТА.

Маладыя кадры

ПРАЦА НА ЗЯМЛІ — ЖЫЦЦЁВАЯ ПАЗІЦЫЯ

Сельгаспрадпрыемства «СлаўМол» — адно з найбольш буйных у Гомельскім раёне. Сёлета гаспадарка ўвайшла ў тройку лідараў па выніках працоўнага спаборніцтва на ўборцы зерневых і зернебабовых культур. Падчас ушанавання аграрыяў з нагоды Дня работнікаў сельскай гаспадаркі і перапрацоўчай прамысловасці агрaпрамысловага комплексу адзначаны ўклад усёй каманды-калектыву «СлаўМола» і яго маладога кіраўніка Ігара Сцяпанава.

Фота з архіва героя.

Сельгасугоддзі гаспадаркі раскінуліся на больш чым дзесяці тысячах гектараў, ралля — на звыш сямі тысячах гектараў. Сельгаспрадпрыемства ў свой час было ўтворана на базе шасці гаспадарак Гомельскага раёна і мяжуе з Рэчыцкім, Веткаўскім і Буда-Кашалёўскім раёнамі. На тэрыторыі, што ахоплівае гаспадарка, — 34 населеныя пункты, дзе сёння жыве амаль 3350 чалавек. Таму і адказнасць каласальная... Бо гэта не толькі вытворчасць, дзе створаны працоўныя месцы, але і галоўная падтрымка для цэлых сем'яў працаўнікоў-вяскоўцаў, мясцовых органаў улады сельскіх населеных пунктах.

Ігар Сцяпанаў — сам вясковы. Нарадзіўся ў Аздзеліна — цэнтральным населеным пункце гэтай жа гаспадаркі. Таму не па чутках ведае, што значыць атрымаць магчымасць рэалізавацца дома, у сельскай мясцовасці.

СТАР. 3

26 студзеня 2025 ВЫБАРЫ ПРЭЗІДЭНТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Асэнсаваная адказнасць

У каляндарным плане выбарчай кампаніі, якая стартавала ў нашай краіне, цяпер рэалізоўваецца трэці пункт — збор подпісаў выбаршчыкаў у падтрымку вылучэння кандыдатаў у Прэзідэнты. Ва ўсіх рэгіёнах краіны заўважана вялікая колькасць пікетаў, на якіх члены ініцыятыўных груп збіраюць подпісы, адзначае Цэнтральная выбарчая камісія Рэспублікі Беларусь і нагадвае: выбаршчык павінен уласнаручна паставіць дату подпісу і распісацца ў падпісным лісце. Таксама выбаршчык мае права паставіць подпіс у падтрымку некалькіх кандыдатур, якія прапаноўваюцца для вылучэння кандыдатамі ў Прэзідэнты, але толькі адзін раз у падтрымку адной і той жа кандыдатуры.

Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

Журналісты «Звязды» і самі актыўна паўдзельнічалі ў гэтым этапе і паназіралі, як ён праходзіць у розных рэгіёнах і розных населеных пунктах.

СТАР. 2

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

У Вялікабрытаніі на фоне падзення колькасці вакансій расце беспрацоўе

Узровень беспрацоўя ў Вялікабрытаніі вырас да 4,3 працэнта на фоне падзення колькасці даступных вакансій. Гэта адзначаецца ў справаздачы Нацыянальнай статыстычнай службы Злучанага Каралеўства, паведаміла ТАСС. Справаздача статыстычнага ведамства ахоплівае трэці квартал. Адзначаецца, што за перыяд са жніўня да кастрычніка колькасць незанятых вакансій скарацілася на 35 тысяч. Цяпер іх налічваецца 831 тысяча — найніжэйшы паказчык з мая 2021 года. Як адзначае The Daily Telegraph, справаздача распаўсюджана на фоне падрыхтоўкі кіраўнікоў кампаній да павышэння падаткаў. Аб гэтым раней аб'явіла міністр фінансаў Вялікабрытаніі Рэйчэл Рыус, заявіўшы аб неабходнасці закрыць такім чынам «чорную дзірку» ў бюджэце.

У Іспаніі зноў аб'явілі трывогу

У Іспанію вяртаюцца смяротна небяспечныя ліўні: праз два тыдні пасля трагічнай паводкі ў Валенсіі пад ударам аказалася паўднёвая правінцыя Малага, паведаміў Euronews. Мясцовыя ўлады разаслалі жыхарам папярэджанні аб стыхіі і папрасілі тры тысячы чалавек, якія жывуць побач з ракой Гуадальёрсэ, пакінуць дамы. У правінцыі закрыты школы, магазіны. Для Малагі, важнага турыстычнага напрамку, быў аб'яўлены чырвоны, максімальны, узровень небяспекі, які пасля знізілі да аранжавага. Сіноптыкі папярэджваюць, што пацярпець ад новага фронту надвор'я могуць і іншыя раёны Іспаніі, у прыватнасці Валенсія і Балеарскія астравы. Метэаўмовы гэтай восені сталі сапраўдным выпрабаваннем для іспанцаў, спецыялісты гавораць аб рэкордзе па колькасці ападкаў за дзесяцігоддзі.

У Аўстраліі рыхтуюць закон аб забароне сацсетак для падлеткаў

Урад Аўстраліі заявіў, што накіруе ў парламент праект закона, згодна з якім дзецям ва ўзросце да 16 гадоў будзе поўнасцю забаронена карыстацца сацыяльнымі сеткамі. Аўстралійскі прэм'ер-міністр Энтані Албанэзэ адзначыў, што законапраект закліканы абараніць дзяцей ад шкоды, якую, на яго думку, наносяць сацсеткі. «Мы робім гэта для ўсіх бацькоў. Іх, таксама, як і мяне, вельмі непакоіць бяспека нашых дзяцей у інтэрнэце», — адзначыў прэм'ер. Плануецца, што забарона на рэгістрацыю ў сацсетках дзяцей ва ўзросце да 16 гадоў стане ўсеагульнай і з гэтага правіла не будзе выключэнняў — напрыклад, у выпадку дазволу з боку бацькоў. Сачыць за выкананнем гэтай нормы павінны будуць самі сацыяльныя сеткі, якім давядзецца самастойна абмежаваць доступ дзяцей да сваіх паслуг.

ISSN 1990 - 763X

КАРАТКА

- **Мінэканомікі разлічвае перавыканаць задачу па росце ВУП у гэтым годзе.**
- Новы метад выяўлення паталогіі грудной аорты запатэнтавалі беларускія кардыёлагі.
- **У Гродне ўручылі пуцёўку першаму ў Беларусі інфармацыйнаму студэнцкаму атраду.**
- Патрабаванні да лакалізацыі прадукцыі для выдачы крэдыту «На родныя тавары» зробяць больш жорсткімі ў 2025 годзе.
- **Доля насельніцтва з узроўнем сярэднедушавых наяўных даходаў ніжэйшым за бюджэт пражытачнага мінімуму (нацыянальнай рысы малазабяспечанасці) за пяць гадоў скарацілася больш як на трэць і склала ў 2023 годзе 3,6 працэнта.**

Маладзёжныя ініцыятывы

Стартапы, інавацыі, бізнес

Як беларускае студэнцтва рэалізуе свае праекты?

У нашай краіне развіццё стартап-руху, падтрымка малых інавацыйных прадпрыемстваў і стымуляванне прадпрымальніцкай актыўнасці грамадзян знаходзяцца на асаблівым кантролі. Уклад малых і сярэдніх прадпрымальніцкіх праектаў у эканамічны рост і сацыяльнае развіццё дзяржавы агульнапрызнаны і значны. Маладыя прадпрымальнікі ў Беларусі маюць магчымасць удзельнічаць у інтэнсівах і конкурсах рэспубліканскага і міжнароднага ўзроўняў, мэта якіх — папулярызацыя тэхналагічнага прадпрымальніцтва сярод маладзёжнай аўдыторыі, забеспячэнне экспертнай і арганізацыйнай падтрымкі стартап-праектаў, выяўленне інвестыцыйна прывабных ідэй. Больш падрабязна аб развіцці стартап-руху ў нашай краіне, развіцці і падтрымцы студэнцкіх маладзёжных бізнес-праектаў даведаўся карэспандэнт «Звязды».

ІНАВАЦЫЙНЫЯ ПРАЕКТЫ БНТУ

Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт славіцца сваімі напрацоўкамі, моцнай матэрыяльна-тэхнічнай базай і прафесарскім складам. Штогод тут з'яўляюцца новыя інавацыйныя праекты. **Намеснік старшыні Савета маладых вучоных БНТУ Яўген МІХАСІК** адзначыў, што кожны факультэт універсітэта асобна адбірае патэнцыйныя інавацыйныя праекты і пачынае іх прасоўваць: «Ёсць некалькі метадаў гэтага прасоўвання. Па-першае, гэта, вядома, навуковыя школы. Так, кандыдат ці доктар навук вядзе студэнта літаральна з першага курса да яго выпуску, магістратуры або аспірантуры. Ён разам са студэнтам распрацоўвае адну тэорыю, мадэль або кірунак».

Па яго словах, студэнты БНТУ рэгулярна ўдзельнічаюць і ў рэспубліканскім конкурсе «100 ідэй для Беларусі»: «Кожны год універсітэт вылучае свае праекты. Яны спачатку праходзяць факультэцкі этап, потым універсітэцкі і так крок за крокам. У мінулым годзе ў нас былі два пераможцы на гэтым конкурсе: праграмнае забеспячэнне CartON і вадародны рухавік, які выклікаў асаблівую цікавасць і сабраў каля свайго стэнда велізарную колькасць зацікаўленых людзей».

СТАР. 3

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

У НОВЫ ГОД – З ЛЮБІМАЙ ГАЗЕТАЙ

Ідзе падпіска на I квартал і I паўгоддзе 2025 года.

Усім, хто падпісаўся на I квартал або I паўгоддзе 2025 года, у падарунак календары: насценны, рэлігійны, народны і месяцавы.

«ДЛЯ МЯНЕ ГЭТА СВЯТА»

З якім настроем мінчане ідуць на збор подпісаў?

Ярка, масава і нават у святочнай абстаноўцы ў беларускай сталіцы праходзяць пікеты па зборы подпісаў выбаршчыкаў у падтрымку вылучэння кандыдатаў у Прэзідэнты Беларусі. 12 лістапада для жыхароў і гасцей Партызанскага раёна каля аднаго з найстарэйшых кінатэатраў «Мір» з нагоды гэтага этапу электаральнай кампаніі адбыўся квэст-канцэрт «Я іду на выбары». А яшчэ ў той дзень тут размясціліся адразу чатыры пікеты па зборы подпісаў. У кожнага ахвотнага была магчымасць падтрымаць як вылучэнне аднаго кандыдата, так і адразу ўсіх чатырох.

Збор подпісаў для вылучэння кандыдатаў у Прэзідэнты Беларусі стартаваў 7 лістапада. Менавіта ў гэты святочны дзень на беразе вадасховішча Вяча, што пад Мінскам, адбыўся III Чэмпіянат СМІ па колцы дроў. Звяздоўцы ў ліку самых першых тады і паставілі свае подпісы і годна прадставілі сябе ў спаборніцтвах.

Сярод тых, хто пакінуў подпіс каля кінатэатра «Мір» у аўторак, большасць — моладзь. Яна актыўна ўдзельнічае ў лёсавызначальнай падзеі для ўсёй краіны. «Гэта мая першая выбарная кампанія, — распавяла жыхарка сталіцы Яўгенія. — Для мяне выбары — гэта сапраўднае свята. Хочацца, каб з кожным годам Беларусь квітнела ўсё больш і больш».

Прадстаўнікі моладзі бяруць актыўны ўдзел у будаўніцтве нашай дзяржавы, лічыць мінчанін Ігар: «Удзел у выбарах і актыўная грамадзянская пазіцыя асабліва важныя сёння. Наша моладзь якраз такая. Мы выступалі і працягваем выступаць за моцную і квітнеючую Беларусь».

Мы папрасілі падзяліцца ўражаннямі тых, хто збірае подпісы. «Людзі масава ўдзельнічаюць у перадвыбарнай кампаніі. Толькі за сёння я спісаў дзесяць падпісных лістоў! — распавёў прадстаўнік ініцыятыўнай групы ў падтрымку Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі Аляксей Аляксандравіч. — Народ прыходзіць з выдатным настроем! Тут пануе святочная атмасфера, гучыць музыка, усім весела».

Аляксей Аляксандравіч упэўнены, што інфармацыі пра выбары дастаткова, таму і пытанняў, як правіла, не ўзнікае: «У гэтым заслуга ў тым ліку і СМІ».

Затым падышлі да жанчын, якія збіралі подпісы за іншага кандыдата. «Сёння тут пануе святочная атмасфера, вельмі шмат моладзі, што не можа не радаваць, — адзначыла Таццяна Сяргееўна. — Многія жадаюць праявіць сваю грамадзянскую пазіцыю, многія падыходзяць, ставяць подпісы. Кожны можа падпісацца нават за ўсіх кандыдатаў адразу. Галоўная — мець пры сабе пашпарт».

Па словах Таццяны Сяргееўны, выбары — гэта заўсёды вялікае свята: «У гэты час мы не толькі праяўляем сваю грамадзянскую пазіцыю, але і галасуем за сваю будучыню, за будучыню нашай краіны. Збор подпісаў, як і заўжды, ідзе ў рабочым парадку. Больш людзей прыходзяць менавіта ў выхадныя і святочныя дні. Станоўчыя эмоцыі выбаршчыкаў заўсёды грэюць душу і сэрца. У цэлым да нас прыходзяць з пазітыўным настроем, задаюць пытанні аб нашым кандыдаце, на якія мы заўсёды з задавальненнем адказваем».

«Мы збіраем подпісы за камуніста, першага сакратара ЦК КПБ, галоўнага рэдактара газеты «Камуніст Беларусі. Мы і час», — паведаміў прадстаўнік ініцыятыўнай групы ў падтрымку Сяргея Аляксандравіча Сыранкова Аляксандр Васільевіч. — Прыходзіць вельмі шмат людзей. Усе цікавяцца. Ва ўсе часы наша партыя стаяла за сацыяльную справядлівасць перш за ўсё для працоўных. Якраз і цікавяцца нашым напрамкам і курсам. Таксама распытваюць аб лініі нашай партыі ў сучаснасці. Мы стараемся адказаць на ўсе пытанні, усё растлумачыць. Наш народ заўсёды быў добразычлівым. Многія людзі, даведаўшыся, што я з'яўляюся яшчэ і членам Саюза пісьменнікаў, задаюць шмат пытанняў аб нашай культуры. Адпаведна, я заўсёды імкнуся нашу культуру прадстаўляць ва ўсім свеце на высокім узроўні».

«Беларусы павінны цікавіцца палітычным жыццём сваёй краіны!» — адзначыла жыхарка сталіцы Алена падчас квэст-канцэрта. Па яе словах, беларусы могуць ганарыцца сваёй краінай.

Прэзідэнцкія выбары — сапраўды лёсавызначальная падзея. Такім меркаваннем падзялілася мінчанка Таццяна. «Трэба думаць аб тым, каб наша Беларусь заставалася і далей надзейнай, свабоднай, мірнай і бяспечнай. За гэта і трэба аддаваць свой голас», — упэўнена жанчына.

Пікеты па сборам подпісаў разгарнуліся ва ўсіх раёнах сталіцы. З 7 да 21 снежня ЦВК будзе прымаць дакументы, неабходныя для рэгістрацыі кандыдатаў. З 22 да 31 снежня адбудзецца рэгістрацыя. Перадвыбарная агітацыя і інфармаванне выбаршчыкаў пройдуць з 1 да 25 студзеня, датэрміновае галасаванне адбудзецца з 21 да 25 студзеня. Выбары Прэзідэнта Беларусі прызначаны на 26 студзеня 2025 года.

Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ, Фота Віктара ДРАЧОВА.

РАЗАМ СУСЕДЗІ, КАЛЕГІ І ЦЭЛЫЯ СЕМ'І

Пазітыў, пашпарт і... подпіс за вылучэнне свайго кандыдата

Жыхары Гомельшчыны не збаўляюць актыўнасці ў імкненні пакінуць подпіс у падтрымку вылучэння кандыдатаў на выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. На пікетах усе дні збору подпісаў шматлюдна. Многія прыходзяць сем'ямі. Высокай актыўнасцю сваю грамадзянскую пазіцыю адзначаюць жыхары Гомельскага раёна.

Іграе музыка, людзі сустракаюцца, абменьваюцца навінамі... Жыхары сельскіх населеных пунктаў падзяліліся, што адкрыццё пікетаў — гэта для іх своеасаблівае невялікае свята, якое аб'ядноўвае людзей.

У пікеце ў аграгарадку Мічурынская актыўна бралі ўдзел як жыхары населенага пункта, так і прадстаўнікі мясцовых арганізацый.

— Згуртоўвае. Людзі ведаюць пра гэтае мерапрыемства, чуюць музыку, збіраюцца, вітаюць адно аднаго, усе з усмешкамі, добрым настроем, — падзялілася Марыя.

— Наш лідар павінен быць мужны, сумленны, адданы сваёй краіне, клапаціцца аб нашых грамадзянах, рабіць усё, каб Беларусь квітнела, развівалася, — расказала Алена.

Нягледзячы на халоднае надвор'е, гэтымі днямі ажыўлена было на пікетах і ў іншых населеных пунктах раёна. Ініцыятыўныя групы прымалі ахвотных пакінуць свой подпіс для вылучэння кандыдатаў у аграгарадках Цярэнічы, Новая Гута, Бярозкі, Урыцкае і іншых.

Пікет па зборы подпісаў за кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь у Прыбары Гомельскага раёна разгарнуўся каля мясцовай крамы. Грамадзяне актыўна падыходзілі, цікавіліся тым, што адбываецца, і ахвотна пакідалі подпісы за «свайго» кандыдата. У буйным населеным пункце — аграгарадку Пакалюбічы — пікеты разгарнуліся з першага дня збору подпісаў для вылучэння кандыдатаў у Прэзідэнты. Жыхары вывучалі інфармацыйныя стэнды, актыўна падпісваліся.

У працэсе збору подпісаў ініцыятыўныя групы ўлічылі спецыфіку Гомельскага раёна. Яго тэрыторыя вельмі значная па плошчы — 21 сельсавет. На мясцовых прадпрыемствах і ў арганізацыях працуюць жыхары Добрушскага, Веткаўскага, Рэчыцкага, Буда-Кашалёўскага раёнаў і самога абласнога цэнтра. Акрамя таго, у прыгарадзе Гомеля вялізная колькасць садовых таварыстваў, і дачнікі таксама могуць прыйсці на пікет.

Як адзначыла каардынатар ініцыятыўнай групы па вылучэнні Лукашэнкі Аляксандра Рыгоравіча — **старшыня Гомельскага раённага аб'яднання прафсаюзаў Ларыса ЛЕГЛІК**, працуюць не толькі на пікетах па зборы подпісаў, але і ў рабочых калектывах, і па месцы жыхарства. Кожны грамадзянін Рэспублікі Беларусь незалежна ад месца рэгістрацыі можа скарыстацца сваім правам пакінуць подпіс у падтрымку вылучэння свайго кандыдата, — патлумачыла Ларыса Леглік.

Каардынатар ініцыятыўнай групы адзначыла, што за вылучэнне дзеючага Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнку людзі падпісваюцца з задавальненнем. Кажуць: «Мы свайго кандыдата ведаем, даўно выбралі і вызначыліся».

Арганізацыя пікетаў будзе прадоўжана ў раёне. Не забудзьцеся ўзяць пашпарт, нагадваюць члены ініцыятыўных груп тым, хто жадае пакінуць подпіс для вылучэння кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь. У падпісным лісце павінны быць подпісы выбаршчыкаў, якія пражываюць на тэрыторыі раёна, горада, раёна ў горадзе. Выбаршчык павінен уласнаручна паставіць дату подпісу і распісацца. Выбаршчык мае права паставіць подпіс у падтрымку некалькіх кандыдатур, якія прапануюцца для вылучэння кандыдатамі ў Прэзідэнты, але толькі адзін раз у падтрымку адной і той жа кандыдатуры.

Наталля КАПРЫЛЕНКА. Фота рэдакцыі Гомельскай раённай газеты «Маяк».

«БЕЛАРУСІ ПАТРЭБНЫ САПРАЎДНЫ ЛІДАР»

Гродзенцы актыўна прымаюць удзел у электаральнай кампаніі

На пікетах, якія арганізаваны ініцыятыўнымі групамі, шматлюдна. Жыхары абласнога цэнтра добра ведаюць гэтыя месцы і прыходзяць сюды ў вызначаны час, каб паставіць свае подпісы ў падтрымку кандыдатаў у Прэзідэнты.

Апоўдні ў цэнтры горада, каля Маладзёжнага цэнтра, размясцілася некалькі ініцыятыўных груп па зборы подпісаў. І тут адразу ўтварылася чарга, якая не памяншалася ўвесь вызначаны час работы пікета. Члены ініцыятыўных груп розных грамадскіх арганізацый амаль не падымалі галавы з-за пастаяннага наплыву гараджан. Яно і зразумела. Усе ахвотныя павінны мець магчымасць прыняць удзел у электаральнай кампаніі па выбары Прэзідэнта на самым першым яе этапе. Праз некаторы час удаецца атрымаць каментарый прадстаўнікоў ініцыятыўных груп па зборы подпісаў.

— Гродзенцы актыўна ідуць, — дзеліцца сваімі назіраннямі **член ініцыятыўнай групы, прадстаўнік Гродзенскай абласной арганізацыі КПБ Жанна МІКША**, — узрост розны, пераважна прыходзяць групамі: сябры, знаёмыя, вельмі шмат моладзі, відавочна, што ідуць асэнсавана, у людзей ёсць свая пазіцыя. Як відаць, свой выбар яны зрабілі, хоць і цікавяцца ўсімі, хто вылучыўся ў кандыдаты. Людзі дасведчаныя, маюць сваё меркаванне, могуць ацаніць грамадска-палітычную сітуацыю ў краіне, у свеце і зрабіць свой выбар. Думаю, што, сапраўды, час выбраў кожнага з нас, на сённяшні дзень мы бачым, як жывём. Гэтым і абумоўлена такая актыўнасць.

Як расказала Жанна Мікша, пікеты па зборы подпісаў у падтрымку вылучэння кандыдатаў у Прэзідэнты праводзяцца ў рэгіёне кожны дзень. Згодна з заканадаўствам, ажыццяўляць такі збор могуць толькі члены ініцыятыўных груп і толькі ў вызначаных для гэтага месцах. Як правіла, яны ўстанаўліваюцца ў цэнтрах гарадоў і іншых населеных пунктаў. Таксама збор подпісаў можа весціся па месцы жыхарства і работы выбаршчыкаў. Кожны член ініцыятыўнай групы мае пры сабе адпаведнае пасведчанне і дакумент з фотаздымкам. У падпісным лісце павінны быць подпісы выбаршчыкаў, якія пражываюць у дадзеным населеным пункце ці на тэрыторыі раёна. Падпісны ліст завяраецца членам ініцыятыўнай групы.

Суразмоўніца звяртае ўвагу, што выбаршчык можа паставіць подпіс у падтрымку некалькіх кандыдатур, якія вылучаюцца кандыдатамі ў Прэзідэнты. Для рэгістрацыі кандыдатам на вышэйшы дзяржаўны пост неабходна сабраць не менш як 100 тысяч подпісаў.

Член іншай ініцыятыўнай групы, **прадстаўнік Гродзенскай гарадской ветэранскай арганізацыі Валянціна РЫЖКЕВІЧ** пацвярджае, што гродзенцы займаюць актыўную пазіцыю падчас збору подпісаў.

— Хутка ў нашай краіне адбудзецца вельмі важнае падзея — выбары Прэзідэнта Беларусі. Бачу, што жыхары абласнога цэнтра не застаюцца ўбаку, ідуць ставіць свае подпісы за патэнцыяльнага кандыдата, якога лічаць дастойным удзельнічаць у гонцы, — кажа жанчына.

Яна зазначае, што механізм збору подпісаў добра адпрацаваны, асабіста яна мае вопыт у гэтай справе. Суразмоўніца прызналася, што яна хоць і пенсіённага ўзросту, мае 43 года працоўнага стажу, але адчувае сваю адказнасць у тым, як праходзіць такая важная для Беларусі палітычная кампанія.

— Вельмі радуе, што ўсё праходзіць спакойна і камфортна, людзі шчырыя, адкрытыя, усміхаюцца, многія прыходзяць сем'ямі, гучыць музыка, вясёлы гоман, — пракаментавала атмасферу Валянціна Рыжкевіч. — Так і павінна быць у нашай краіне, дзе ўсё робіцца для людзей.

Між тым ахвотных аддаць свой подпіс усё большала. Знаёмімся з прадстаўнікамі Гродзенскай абласной калегіі адвакатаў, якія падчас абедзеннага перапынку прыйшлі падтрымаць вылучэнне кандыдата ў Прэзідэнты.

— Што датычыць электаральнай кампаніі, гэта наш грамадзянскі і чалавечы абавязак, мы гэтым выказваем сваю пазіцыю. І такіх людзей, па ўсёй бачнасці, даволі шмат. Вельмі добра, што дадзена такая магчымасць прыйсці ў цэнтр горада і падпісацца за вылучэнне кандыдатаў у Прэзідэнты, — зазначыў Вадзім Чарапіца.

— Лічу, важна выканаць свой грамадзянскі абавязак, тым самым выступіць за нашу мірную краіну, незалежную і суверэнную. Нам неабыякава, хто стаіць на чале дзяржавы, Беларусі патрэбен сапраўдны лідар. Мы ўдзельнічаем у зборы подпісаў, бо маем сваю трывалую думку наконт гэтага, можам параўнаць, якая была краіна некалькі дзесяцігоддзяў таму і якая яна цяпер, — выказала меркаванне Наталля Ганчарук.

Алена Скрабакіна дадала, што жыве ў Гродне 30 гадоў і на яе вачах горад імкліва развіваецца. «Гэта робіцца дзякуючы таму курсу, якім ідзе наша краіна. Будуецца жыллё, сацыяльныя аб'екты, дарогі сталі значна лепшымі. Мы за мір, таму мы тут», — рэзюмавала яна сваю пазіцыю.

Па маіх назіраннях, усе людзі, якія прыйшлі да месца збору подпісаў, маюць пазітыўны настрой. Без сумневу, усе яны хочуць, каб краіна заставалася астраўком бяспекі і развівала добрасуседскія адносіны. А подпісы — свайго роду ўклад кожнага ў будучыню Беларусі.

— Людзі не чакаюць, каб да іх прыйшлі члены ініцыятыўнай групы па подпісы, а імкнуцца самі выказаць сваю грамадзянскую пазіцыю, — кажа гродзенец Аляксандр Радыёнаў. — Мы бачым тут розныя ўзроставыя катэгорыі, але іх аб'ядноўвае той факт, што краіна 80 гадоў жыве пад мірным небам. Таму ставім подпіс за тое, каб так было і надалей. А гэта дарагога варта. Мне здаецца, што цяпер вельмі важна нам, беларусам, праявіць актыўнасць і падпісацца ў падтрымку ўдзельнікаў прэзідэнцкай гонкі. Наш грамадзянскі абавязак — даць права і магчымасць удзельнічаць у выбарах Прэзідэнта Беларусі. Асабіста я паставіў свой подпіс за мірнае неба, бяспеку, шчаслівую будучыню. Сёння наша краіна стаіць на моцным фундаменце, яна развіваецца і з кожным годам становіцца лепшай. Трэба ўсё гэта зберагчы. Вакол Беларусі неспакойна, таму важна захаваць мір.

Некаторыя гродзенцы вырашылі сумясціць збор подпісаў са шпацырам па горадзе. На дварэ хоць і восеньскі дзень, але горад не страціў прывабнасці, у цэнтры нямала месцаў адпачынку, утульных кафэ, дзе можна выпіць кубачак кавы і абмеркаваць тое, што хвалюе. Некаторыя гараджане нават прызначылі сустрэчу каля пікета, каб потым разам прайсціся па гістарычным цэнтры старажытнага Гродна. У іх ліку — маладая гродзенка Наталля Ляшук, якая разам са сваімі сябрамі прыйшла падпісацца за мірную працу.

— Сёння тут, у цэнтры горада, вельмі шмат людзей, таму стаім у чарзе, каб падпісацца за вылучэнне свайго кандыдата ў Прэзідэнты. Я ведаю, што ў сваёй краіне ніколі не застануся адна, што побач добрыя і чулыя людзі, мае сябры, якія заўсёды дапамогуць. Такая краіна мне патрэбна, — выказала сваю пазіцыю Наталля.

За будучыню гатова галасаваць гродзенка Іна, якая адчувае сябе сацыяльна абароненай і ўпэўненай у заўтрашнім дні. Яна цэніць мірнае жыццё і не хоча, каб у нашай краіне былі войны, голад, разбурэнне. Таму не застаецца ўбаку, а дзейнічае так, як падказвае сумленне і сэрца.

— Як і многія гродзенцы, я прыйшоў сюды, каб паставіць подпіс за вылучэнне кандыдата ў Прэзідэнты, — кажа Петр Касіцкі. — Я за стабільнасць, за нашу Беларусь, за нашых дзяцей, жыццё пад мірным небам, за ўсё найлепшае. Сёння важна не быць проста крытыкам, а праяўляць сваю грамадзянскую пазіцыю і ўмець абараніць тыя прынцыпы, якімі жыве краіна.

Звяртаю ўвагу на групу жанчын, якія не толькі ставяць свае подпісы, але і робяць здымкі каля пікетаў. Чаму ім важна зафіксаваць гэты момант? — пытаюся. Аказалася, што ўсе яны працуюць у філіяле агракамбіната «Скідзельскі». Подпісы — гэта пачатак іх удзелу ў электаральнай кампаніі. Яны лічаць, што гэта, у першую чаргу, патрэбна самім выбаршчыкам.

— У мяне шматдзетная сям'я, трое дзетак, усе выдатна вучацца, я імі вельмі ганаруся, стараюся даць ім як мага больш, але без падтрымкі дзяржавы наўрад ці гэта атрымалася б. Дзеці могуць бясплатна займацца спортам, для іх развіцця ёсць усе магчымасці, гурткі, спартыўныя пляцоўкі, бясплатнае харчаванне ў школе, ведаю, што дзеці заўсёды сытыя, а гэта здароўе, — выказалася Алена Жвірбля.

Яе калега Марына Сяркова дадала, што беларусы сацыяльна абароненыя ў сваёй краіне. Напрыклад, дзякуючы дзяржаўнай падтрымцы ёсць магчымасць выязджаць на аздараўленне ў санаторыі, гэта даступна. Да свят прадпрыемства заўсёды аказвае матэрыяльную дапамогу.

Жанчыны лічаць, што кожны павінен прымаць удзел у выбарах, выказаць сваю грамадзянскую пазіцыю і паставіць подпісы за свайго кандыдата, які захавае тыя дасягненні, якія ёсць, і памножыць іх.

Збор подпісаў за вылучэнне кандыдатаў у Прэзідэнты працягнецца да 6 снежня. Як адзначыў старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір Каранік падчас нядаўняй нарады па арганізацыйным забеспячэнні электаральнай кампаніі, у грамадстве высокі запыт на справядлівасць і грамадзяне гатовы адстойваць сваё канстытуцыйнае права. Яны актыўна падтрымалі змены ў Канстытуцыю Беларусі наконт ідэі ўмацавання палітычнага і эканамічнага плюралізму, партыйнага будаўніцтва, павышэння ролі дзяржавы ў забеспячэнні нацыянальных інтарэсаў. Таму задача органаў дзяржаўнага кіравання — забяспечыць грамадзянам магчымасць рэалізацыі іх правоў у рамках заканадаўства.

Маргарыта УШКЕВІЧ, фота аўтара.

Сацапытанне

АБСАЛЮТНАЯ БОЛЬШАСЦЬ БЕЛАРУСАЎ БЯРУЦЬ УДЗЕЛ У ВЫБАРАХ

Такія даныя сацыялагічнага даследавання карэспандэнту БЕЛТА прывёў дырэктар аналітычнага цэнтра ЕсооМ Сяргей Мусіенка.

Рэспандэнтам прапаноўвалася адказаць на пытанне: «У Беларусі ў 2025 годзе пройдзе галасаванне на выбарах Прэзідэнта. А вы асабіста звычайна прымаеце ўдзел у выбарах?»

«Заўсёды прымаю ўдзел у выбарах» адказалі 65,1 % апытаных, «Стараюся хадзіць на выбары» — 15,7 %, «Усё залежыць ад сітуацыі: часам — так, часам — не» — 7,1 %, «Прынцыпова не хаджу на выбары» — 6,2 %, «Цяжка адказаць» — 5,9 %.

«Гэта адпавядае рэальнасці. Мы адзначаем высокую яўку на выбарах у апошнія дзесяцігоддзі. Людзі лічаць гэта сваім абавязкам. Гэта фізічна бачна па выбарчых участках, якая колькасць людзей прыходзіць. Значыць, мы забяспечваем празрыстыя, выразныя магчымасці галасаваць людзям. І яны гэта выказваюць, выконваючы свой грамадзянскі абавязак. Мы гэта назіраем з году ў год», — адзначыў аналітык.

У БЕЛАРУСІ Ў 2025 ГОДЗЕ ПРОЙДЗЕ ГАЛАСАВАННЕ НА ВЫБАРАХ ПРЭЗІДЭНТА. А ВЫ АСАБІСТА ЗВЫЧАЙНА БЕРАЦЕ ЎДЗЕЛ У ВЫБАРАХ?

Даследаванне «Фактары ўстойлівага развіцця» праведзена Аналітычным цэнтрам ЕсооМ з 1 да 21 кастрычніка 2024 года. Апытана 1580 рэспандэнтаў.

Парламенцкі дзённік

АКЦЭНТЫ ВІЦЕБСКІХ ЗВАРОТАЎ

У гарадскім пасёлку Шуміліна, што на Віцебшчыне, прайшло пашыранае пасяджэнне Прэзідыума Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі, на якім былі падведзены вынікі работы са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб у Віцебскай вобласці. Адзіны дзень прыёму грамадзян сенатарамі ў паўночным рэгіёне адбыўся 11 лістапада.

Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА адзначыла, што па выніках прыёму 11 лістапада зваротаў ад жыхароў паўночнага рэгіёна было няшмат у параўнанні з іншымі абласцямі. Тым не менш каля 30 працэнтаў агучаных грамадзянамі праблем датычыліся работы жыллёва-камунальнай гаспадаркі. «Тое, як кіраўнік працуе з людзьмі і як людзі ўспрымаюць яго працу, адбіваецца на іміджы ўсёй улады нашай краіны. На гэтым Прэзідэнт акцэнтаваў асаблівую ўвагу», — падкрэсліла Наталля Іванаўна і дадала, што работа з насельніцтвам была і заўсёды будзе актуальнай, таму што палітыка, якая праводзіцца ў краіне, накіравана на паляпшэнне дабрабыту нашых грамадзян.

За студзень — верасень бягучага года ў супастаўленні са студзенем — вераснем 2022 года колькасць зваротаў ад жыхароў Віцебскай вобласці знізілася на 19 працэнтаў. На працягу 2022—2024 гадоў працэнт зваротаў ад жыхароў паўночнага рэгіёна заставаўся адным з найменшых сярод рэгіёнаў краіны, на бягучы момант гэты паказчык складае 10 працэнтаў. За мінулы перыяд у цэлым па краіне колькасць зваротаў у Савет Рэспублікі павялічылася. За дзевяць месяцаў бягучага года іх паступіла ўжо 5416, што на тры працэнты больш, чым у папярэднім годзе. У 2022—2023 гадах Віцебская вобласць знаходзілася на чацвёртым месцы сярод сямі рэгіёнаў краіны па колькасці зваротаў. У бягучым годзе ўдзельная вага адна з найменшых, менш толькі ў Магілёўскай вобласці.

Звяртаючыся да ўдзельнікаў пашыранага пасяджэння, на якім прысутнічалі дэпутаты ўсіх узроўняў, Наталля Качанава засяродзіла ўвагу на трох асноўных пунктах, на якія органам мясцовага самакіравання неабходна звярнуць увагу ў рабоце са зваротамі грамадзян. Па-першае, уменне слухаць і размаўляць. «Недапушчальна, што, выходзячы са зваротаў людзей, кіраўніцтва выканаўчых камітэтаў і адказных службаў можа адказваць па-хамску. Кожны з вас павінен быць псіхолагам, праяўляць павагу і быць тактычным у зносінах з любым чалавекам, які звярнуўся па дапамогу. Недарэмна Прэзідэнт гаварыў, што часам чалавеку трэба не фізічная дапамога, а быць пачутым. Памятайце, што людзей нельга адштурхоўваць. Не ў вашай кампетэнцыі вырашыць праблему — звярніцеся да нас. Калі зварот правамерны, мы акажам дапамогу агульнымі сіламі», — адзначыла спікер.

Па-другое, адкласці практыку накіроўваць людзей у суд з нагоды і без. «Так быць не павінна. Пытанні работы ЖКГ, стану дарог, зямельныя праблемы — усё гэта можна вырашыць на ўзроўні раённых і абласных выканкамаў, міністэрстваў. Калі пытанне ляжыць у плоскасці міжасобасных канфліктаў — гэта іншая справа. У нашай краіне выбудавана ўнікальная сістэма работы са зваротамі грамадзян, таму імкніцеся гэтыя вузлы завязаныя распутваць», — падкрэсліла Старшыня Савета Рэспублікі.

Трэці пункт — работа са зваротамі грамадзян, якія не задаволены судовымі рашэннямі. «Гэта ўжо не ў нашай кампетэнцыі, аднак людзей усё роўна трэба выслухаць і растлумачыць. Самае небяспечнае для мясцовых органаў улады — гэта калектыўныя і паўторныя звароты. Такога быць не павінна, гэта дрэнная тэндэнцыя. Калі пытанне нельга вырашыць ніяк, трэба асабіста сустрэцца з людзьмі, растлумачыць, што дадзенае пытанне вырашыць нельга або можна, але пазней», — заключыла Качанава.

Аб чым яшчэ ішла гаворка ў Шуміліне, чытайце ў найбліжэйшым выпуску «Мясцовага самакіравання».

Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.
Фота БелТА.
г. п. Шуміліна.

Акцыя

Бабруйск святкуе, Бабруйск танцуе...

Горад на Беразіне далучыўся да рэспубліканскай грамадска-культурнай акцыі «Марафон адзінства»

Свята адчуваецца ў кожным куточку горада, які адразу ж стаў больш урачыстым, усмешлівым, актыўным. Гэтыя рысы характэрны для бабруйчан. Тут асаблівы клімат. А яшчэ імкненне быць арыгінальнымі, непаўторнымі і, галоўнае, згуртаванымі. Бабруйчане чакалі свята, рыхтаваліся, звяралі гадзіннікі. І вось яно прыйшло!

Яшчэ напярэдадні рэспубліканскай акцыі кіраўніцтва горада чарговы раз праінспектавала асноўныя лакацыі мерапрыемства.

— Па ўсім горадзе ўстаноўлены банеры, паказальнікі, каб сарыентаваць людзей, дзе што адбудзецца, — паведаміў **намеснік старшыні Бабруйскага гарвыканкама Уладзімір КНІГА**. — Жыхары цікавяцца, як, напрыклад, трапіць на «Знакавую сустрэчу» з удзелам заслужанага артыста Беларусі Руслана Аляхно, 21-разовага паралімпійца Ігара Бокага, генеральнага дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Вадзім Гігіна. Яна адбудзецца ў абласным тэатры драмы і камедыі імя В. Дуніна-Марцінкевіча. Афішы ўжо за некалькі дзён да пачатку мерапрыемства заклікалі далучыцца. Некаторыя бабруйчане наогул здзіўляліся, што трапіць сюды можна бясплатна. Бо ў афішы спрэс вядомыя прозвішчы медыйных асоб, якія на слыху.

Учора рэспубліканская акцыя цалкам запоўніла горад, зарадзіла яго драйвам, святочным настроем, трапіла на прадпрыемствы, ва ўстановы адукацыі. Навучэнцы Бабруйскага дзяржаўнага механіка-тэхналагічнага каледжа з першых хвілін захапіліся тэмай «НЯсумнай НЯлекцыі». На ёй ім прапанавалі выбраць паміж... яблыкам і вафляй. Чацвёртакурснік Ілля Дзікалаў выбраў яблык. «Я за здаровы лад жыцця, — аргументаваў ён. — Мы кожны дзень сутыкаемся з выбарам — ісці на лекцыю або не, зрабіць зарадку або не, купіць шакаладку або той жа яблык. Трэба рабіць усё асэнсавана, памятаючы пра наступствы».

— Сама назва «НЯсумная НЯлекцыя» прывабліваe, — адзначыла ў размове з журналістамі **намеснік міністра адукацыі Кацярына ПЯТРУЦКАЯ**. — Мы размясцілі афішы загадзя, і ў навучэнцаў быў выбар прыйсці або не. Ім падабаецца адкрыты фармат, мы праводзім «НЯсумныя НЯлекцыі» ў вялікіх аўдыторыях, адкрытых фае, дзе не бывае заняткаў. У нас шмат крэатыўных творчых выкладчыкаў, якія працуюць нестандартна. Цікавасць да прадмета наогул пачынаецца з цікавасці да асобы выкладчыка. А нашы педагогі ўмеюць валодаць увагай аўдыторыі, методыкай, забяспечваюць якасць выкладання, вядуць за сабой моладзь.

Удзельнікамі «НЯсумнай НЯлекцыі» ў каледжы сталі прадстаўнікі кіраўніцтва МАЗа, прадпрыемства, якое з'яўляецца заказчыкам кадраў, якіх рыхтуюць у каледжы. У навучэнцаў была магчымасць задаць пытанне наўпрост, пацікавіцца, што трэба для таго, каб прайсці кар'ерную лесвіцу і заняць кіруючыя пасады.

Наогул, у праграме шмат крэатыўных нестандартных падыходаў, якія спачатку бянтэжаць, а потым цалкам апаноўваюць увагай. Упершыню ў Бабруйску на заводзе буйнапанэльнага домабудавання практыкавалі такі незвычайны экспромт, як танцы ў цэху. Спецыяльна для канцэрта «Разам працуем, разам спяваем» працоўная пляцоўка на некаторы час ператварылася ў канцэртную. Кранаўшчыкі, мантажнікі, арматуршчыкі ў рабочым адзенні «запальвалі» ўслед за беларускімі зоркамі. «Не сустрэча — агонь», — так ацанілі мерапрыемства яго ўдзельнікі. Эмоцыі што ні ёсць сапраўдныя. На тварах — усмешкі, у вачах — агеньчыкі.

У ліку чаканых падзей — удзел у марафоне Прэзідэнцкага аркестра Рэспублікі Беларусь, асабліва для музычнай школы № 2. Учора артысты аркестра правялі ў навучальнай установе майстар-класы. А сёння заслужаны калектыў выступіць на ААТ «ФанДАК».

У горадзе праходзіць шэраг выстаў. Ужо ў першы дзень шмат бабруйчан наведалі выставу «Беларусь. Узлёт» Беларускага тэлеграфнага агенцтва. Яна размясцілася ў гандлёвым цэнтры па вуліцы Мінскай. Сорак яркіх здымкаў, зробленых трыццаць гадоў таму і цяпер. Факты, як той казаў, сведчаць за сябе.

А ў Бабруйскім мастацкім музеі па вуліцы Горкага была магчымасць далучыцца да інтэрактыўнай выставы «Подзвігі і лёсы партызан у дакументах», заснаванай на матэрыялах унікальнага мультымедыйнага інтэрнэт-праекта «Партызаны Беларусі». Яе прэзентавалі Выдавецкі дом «Беларусь сегодня» і Нацыянальны архіў. У экспазіцыі — унікальныя фатаграфіі часоў Вялікай Айчыннай вайны, узнагародныя лісты і баявыя характарыстыкі вядомых камбрыгаў, Герояў Савецкага Саюза, радавых байцоў партызанскіх атрадаў. Сёння выставу можна наведаць на пляцоўцы перад спартыўным комплексам «Бабруйск-Арэна».

Як выказаўся ў дзень пачатку акцыі ў Бабруйску **генеральны дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Вадзім ГІГІН** у эфіры ток-шоу «Будні» на «Альфа Радыё», праз розныя формы — лектарскія, асветніцкія, псіхалагічныя трэнінгі, музычныя шоу, выступленні спікераў — дэманструецца адзінства, кансалідацыя грамадства, агульнасць культуры, ідэалагічных поглядаў, палітычнай пазіцыі. «Мы разам», «Мы адзіныя», «Час выбраў нас», «Мы за мір» — гэтыя пасылы зразумелыя кожнаму.

Суботняя праграма марафону яшчэ больш насычаная. З 10:00 да 22:00 каля «Бабруйск-Арэны» праходзіць праграма актыўнасцяў, працуюць забаўляльныя пляцоўкі, фудкорты, праводзіцца квэст ад БРСМ і розыгрышы прызоў. Завершыць марафон музычнае шоу «Час выбраў нас», у якім прымуць удзел заслужаныя артысты Беларусі Руслан Аляхно, Алена Ланская, арт-група «Беларусы», група «Аўра» і іншыя.

Больш падрабязна пра другі дзень марафону чытайце ў наступным нумары «Звязды».

Нэлі ЗІГУЛЯ.

Стартапы, інавацыі, бізнес

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

У ВНУ наладжана ўзаемадзеянне з Паркам высокіх тэхналогій. Так, у ліпені 2024 года паміж БНТУ і Сакратарыятам назіральнага савета Парка высокіх тэхналогій было падпісана пагадненне аб узаемадзеянні ў сферы інавацыйна-прадпрымальніцкай дзейнасці ва ўніверсітэцкім асяроддзі. «У адпаведнасці з гэтым прадстаўнікі ўніверсітэта наведалі два семінары на базе бізнес-інкубатара. Таксама ў гэтыя дні на базе БНТУ праходзіць «Школа маладых вучоных», куды былі запрошаныя ў якасці спікераў прадстаўнікі стартап-руху Беларусі, напрыклад намеснік начальніка Парка высокіх тэхналогій Кірыл Залескі», — дадаў Яўген Міхасік.

Ён адзначыў, што падобныя госці запрашаюцца для таго, каб данесці студэнтам, што іх навуковая дзейнасць не абмяжоўваецца конкурсамі або канферэнцыямі: «Вы можаце працягваць сваю дзейнасць, і ўжо камерцыялізаваць яе. Атрымліваць ад гэтага пэўную выгаду і паказваць яе больш шырокім масам».

Акрамя таго, у БНТУ ёсць навукова-тэхналагічны парк «Палітэхнік». У сваю чаргу гэта з'яўляецца перавагай для развіцця стартап-руху. Як адзначыў Яўген Міхасік, маладыя вучоныя, якія прыходзяць у БНТУ, могуць атрымаць падтрымку і першыя ўласныя ўзоры, а таксама дапамогу ў прасоўванні свайго праекта. Значнасць «Палітэхніка» вылучаюць нават прадстаўнікі Парка высокіх тэхналогій, таму што вельмі многія пачыналі менавіта ў парку ўніверсітэта.

НАВУКОВА-ІНАВАЦЫЙНЫ ВЕКТАР БДУІРА

Сёння дасягненні Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі на слыху амаль ва ўсіх. Універсітэт вылучае два кірункі работы з моладдзю па навукова-інавацыйным вектары. Пра гэта расказала **загадчыца студэнцкай навукова-даследчай лабараторыі БДУІРа Марыя БАРАНАВА**: «У першым выпадку студэнты могуць далучыцца да традыцыйнай навуковай школы пад кіраўніцтвам прафесіянала, які будзе пазначаць задачы для тых, хто толькі робіць першыя крокі ў навуцы. Па выніках іх выканання студэнты пачнуць пісаць і публікаваць даследчыя артыкулы».

Іншы шлях, па яе словах, існуе для тых студэнтаў, якія ўжо вызначыліся са сваёй інавацыйнай ідэяй, якая не супадае са спецыфікай лабараторый: «Такое здараецца тады, калі маладзёжная ідэя ў большай ступені менавіта інавацыйная, а не навуковая, таму для яе рэалізацыі і стварэння прататыпа неабходная адпаведная інфраструктура і рэсурсы. Дапамагае з гэтым ВНУ».

Марыя Баранава дадала, што ўжо другі год універсітэт вылучае з уласных унутраных сродкаў невялікія гранты: «На спаборніцкай аснове мы штогод праводзім конкурс інавацыйных ідэй студэнтаў. Да яго прыцягваюцца, дарэчы, не толькі студэнты, але і навучэнцы Мінскага радыётэхнічнага каледжа, і іх праекты часта не саступаюць студэнцкім. Маладыя людзі вытрымліваюць конкурс, які складаецца з двух этапаў: завочнага і вочнага тураў. Па выніках гэтага конкурсу мы прапануем некаторым хлопцам і дзяўчатам, якія вылучылі самыя перспектыўныя ідэі, рэалізаваць іх праекты на базе нашай лабараторыі».

Па яе словах, гэта дапамагае маладым даследчыкам напісаць тэхнічнае заданне, аказвае садзейнічанне на ўсіх этапах выканання праекта. Акрамя таго, студэнтаў афіцыйна працаўладкоўваюць, і многія з іх такім чынам атрымліваюць першае працоўнае месца, што развівае ў іх адказнасць і дазваляе выдаткоўваць хай невялікую, але зарплату на неабходныя для стварэння распрацоўкі матэрыялы і камплектуючыя. Матэрыяльна-тэхнічную базу для работы дае сталічны радыётэхнічны каледж, для чаго было падпісана пагадненне. 3D-прынтэр для прататыпа або паяльная станцыя — усё гэта ёсць у вольным доступе для вучоных-пачаткоўцаў і распрацоўшчыкаў.

«Любая работа павінна вылівацца ў вынік. Мы з нашымі студэнтамі стараемся абавязкова праходзіць разнастайныя конкурсы. Прыярытэтны для нас — «100 ідэй для Беларусі». Я тлумачу студэнтам і навучэнцам: толькі так вы атрымліваеце экспертную ацэнку, набіваеце першыя шышкі, — падкрэсліла Марыя Баранава. — І тут узнікае лагічнае пытанне, да якой стадыі ВНУ павінна даводзіць праект, суправаджаючы маладых людзей? Магчыма, нашы студэнты не ў хуткім часе стануць «аднарогамі», зарабіўшы першы мільярд, але, прайшоўшы гэтую школу, веды і навыкі атрымаюць дакладна для будучай работы і запуску паспяховага бізнесу. Безумоўна, я веру, што некаторыя з нашых студэнтаў здольныя ў юным узросце запускаць прыбытковыя стартапы, таму мы актыўна развіваем інфраструктуру, якая дапамагла б падхапіць перспектыўную ідэю і давесці яе да слыху інвестараў, расказаць пра студэнтаў буйным прадпрыемствам».

Сёння БДУІР імкнецца маштабаваць у распрацоўках і IT-кірунак, арыентуючы студэнтаў на міждысцыплінарныя даследаванні. Марыя Баранава адзначыла: «IT — гэта ў першую чаргу інструмент як для медыцыны, так і для прамысловасці. Любы сучасны станок сёння праграмавальны, таму ў гэтай сферы заўсёды запатрабаваны інавацыі, без якіх развіццё ў любой галіне прамысловасці не ўяўляецца магчымым».

ІДЭІ І ДАСЯГНЕННІ ГРДУ

На базе ўніверсітэта ў Гродна праходзіць конкурс «ІнНаСтарт». Ён прызначаны для маладых людзей, якія маюць ідэі інавацыйных стартап-праектаў і зацікаўленыя ў іх рэалізацыі ў розных галінах і сферах дзейнасці. Пра гэта распавяла **начальнік цэнтра трансферу тэхналогій ГрДУ Алена АПЯКУН**.

«Наша мэта — актывізацыя інавацыйнай і прадпрымальніцкай дзейнасці моладзі, забеспячэнне экспертнай і арганізацыйнай падтрымкі стартап-праектаў і выяўленне інвестыцыйна-прывабных ідэй. На першым этапе праводзім адукацыйныя мерапрыемствы для ўдзельнікаў, такія як семінар-трэнінг «Як апісаць бізнес-ідэю». Праводзім трэнінгі і індывідуальныя кансультацыі для ўдзельнікаў конкурсу па распрацоўцы праектнай ідэі, фарміраванні каманды праекта, распрацоўцы бізнес-мадэлі, бізнес-плана, прататыпа, пытаннях фінансавання праекта, маркетынгавых рызык, ладзім прэзентацыі студэнцкіх распрацовак і іх абмеркаванне», — падзялілася Алена Апякун.

Гэты этап працягнецца да 28 лістапада, пасля чаго адбудзецца фінал. Пераможцам конкурсу будзе дадзена магчымасць атрымання фінансавання для рэалізацыі стартап-праекта пры падтрымцы ўніверсітэта і права прадстаўляць ВНУ на рэспубліканскіх і міжнародных конкурсах.

Алена Апякун дадала, што конкурс «ІнНаСтарт» праходзіць у пяці намінацыях: «У намінацыі «Бізнес-інавацыя» прадстаўляюцца стартап-праекты, рэалізацыя якіх можа дазволіць арганізаваць інавацыйную вытворчасць, забяспечыць якасны або колькасны рост вытворчасці, палепшыць бізнес-працэсы арганізацыі. Намінацыя «Сацыяльная ініцыятыва» ўключае некамерцыйныя/сацыяльныя стартап-праекты, рэалізацыя якіх не прадугледжвае атрымання камерцыйнай выгады, але можа забяспечыць рэалізацыю карысных для грамадства або асобных сацыяльных груп ініцыятыў. «Праект для ўніверсітэта» збірае інавацыйныя ініцыятывы ў рамках рэалізацыі стратэгіі апераджальнага развіцця ВНУ па праектах: інавацыйна-ўспрымальны ўніверсітэт, універсітэт без меж, смарт-універсітэт, універсітэт устойлівага развіцця, асобна арыентаваны ўніверсітэт. У намінацыі «Інавацыйнае IT-рашэнне для бізнесу» разглядаюцца створаныя маладымі людзьмі дадаткі для гаджэтаў, інфармацыйныя сістэмы, чат-боты. І нарэшце, «Футурыстычная ідэя» — намінацыя для тых, хто працуе над стартап-праектамі будучыні на аснове навуковых дасягненняў у галіне прыродазнаўчых, тэхнічных і гуманітарных навук».

На працягу тыдня пасля завяршэння першага этапа конкурсу экспертная камісія вызначыць пераможцаў. Па заканчэнні конкурсу ўдзельнікам будзе дадзена магчымасць дапрацоўкі бізнес-ідэй ва ўніверсітэцкай студыі праектаў і стартапаў сумесна з кіраўнікамі стартап-праектаў за кошт сродкаў універсітэта.

Аб рэспубліканскім конкурсе «100 ідэй для Беларусі», развіцці стартап-руху сярод моладзі, членаў БРСМ чытайце ў наступным нумары «Чырвонка. Чырвоная змена».

Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.
Фота Лізаветы ГОЛАД.

ПРАЦА НА ЗЯМЛІ — ЖЫЦЦЁВАЯ ПАЗІЦЫЯ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Малады кіраўнік УСП «СлаўМол» — нядаўні ўдзельнік унікальнага губернатарскага праекта «З рэзерву — у кіраўнікі», які з вясны 2022 года пачаў актыўна ўкараняцца на Гомельшчыне. Ігар Канстанцінавіч тады стаў намеснікам кіраўніка УСП «СлаўМол». Пасля некалькі месяцаў выконваў абавязкі кіраўніка гэтага сельгаспрадпрыемства, а ў жніўні бягучага года назначаны на пасаду дырэктара «СлаўМола».

Між тым у роднай гаспадарцы Ігар Сцяпанаў прайшоў шлях ад брыгадзіра паляводчай брыгады да галоўнага агранома. На гэтым сельгаспрадпрыемстве ў свой час да выхаду на пенсію працавалі і бацькі Ігара Сцяпанава: бацька, Канстанцін Фёдаравіч, інжынерам, маці, Таццяна Аляксандраўна, галоўным заатэхнікам, а некаторы час і намеснікам дырэктара па жывёлагадоўлі. Сын Ігар пасля школы пайшоў вучыцца на агранома ў Краснабярэжскі дзяржаўны каледж, затым паступіў у Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт. Па размеркаванні трапіў на першае месца работы ў Светлагорскі раён, аднак вельмі цягнула дадому — пераразмеркаваўся ў «СлаўМол». На працягу года малады чалавек быў брыгадзірам паляводчай брыгады. Паспеў адслужыць па прызыве і ў войску і зноў вярнуцца ў родную гаспадарку.

Мэтанакіраваны, з аналітычным складам, шчырым жаданнем вучыцца, расці ў сваёй прафесіі... Натуральна, што Ігар Сцяпанаў трапіў у рэзерв кіруючых кадраў аблвыканкама. А пасля быў запрошаны стаць адным з удзельнікаў праекта «З рэзерву — у кіраўнікі» — па ініцыятыве старшыні аблвыканкама Івана Крупко па рабоце з «рэзервістамі» і падрыхтоўцы будучых кіраўнікоў-аграрыяў. Ігара Сцяпанава ў імкненні паспрабаваць свае сілы ў праекце падтрымалі і сям'я, і калегі.

— Хацелася паспрабаваць сябе і ў ролі кіруючага работніка. Калі ў гаспадарцы ўзначальваў агранамічную службу, цікавіўся і сумежным кірункам — жывёлагадоўляй, — згадаў малады кіраўнік УСП «СлаўМол». Ён перакананы, што праект «З рэзерву — у кіраўнікі» — магчымасць для маладых аграрыяў праявіць сябе, атрымаць багацейшы жыццёвы і прафесійны вопыт.

— Каласальная адказнасць за людзей, за выкананне пастаўленых вытворчых задач. Вельмі важна, лічу, будаваць працу калектыву так, каб яна прыносіла эканамічны эфект, і выклікала гонар за вынікі работы, давала радасць, — падзяліўся Ігар Сцяпанаў.

Адказнасць у маладога кіраўніка буйной гаспадаркі, сапраўды, вялікая. У структуры УСП «СлаўМол» — два малочнатаварныя комплексы, пяць МТФ і чатыры фермы па вырошчванні маладняку буйной рагатай жывёлы, машынна-трактарныя паркі, рамонтна-механічныя майстэрні, дзве паляводчыя і адна будаўнічая брыгады, піларамы і чатыры зернясховішчы. Усяго ў складзе гаспадаркі 11 жывёлагадоўчых фермаў, сем з іх — малочнатаварныя. Траціну пагалоўя буйной рагатай жывёлы займае дойны статак — 2710 кароў.

— Нашы асноўныя вытворчыя спецыялізацыі — вырошчванне збожжавых і зернебабовых, кармавых і тэхнічных культур, вытворчасць малака і мяса.

У раслінаводстве робім стаўку на ўкараненне прагрэсіўных тэхналогій, павышэнне эфектыўнасці выкарыстання зямель, — падкрэсліў Ігар Канстанцінавіч.

Павялічваць аб'ёмы вытворчасці жывёлагадоўчай прадукцыі і паляпшаць яе якасць гаспадарцы дазваляе планавая мадэрнізацыя жывёлагадоўчых аб'ектаў і абнаўленне абсталявання.

— Сярод важных задач, якія ставім для сябе, — павышэнне ўраджайнасці, паляпшэнне якасці, забеспячэнне большай устойлівасці вытворчасці збожжа. У жывёлагадоўлі важная задача — павелічэнне прадукцыйнасці жывёл малочнага і мясного кірунку, павышэнне якасці прадукцыі, якая рэалізуецца, зніжэнне выдаткаў на яе вытворчасць. Аснова для гэтага — паляпшэнне пародснага складу жывёлы, спосабаў утрымання і рацыёнаў кармлення, механізацыя вытворчых працэсаў, — дадаў малады кіраўнік гаспадаркі.

Наталля КАПРЫЛЕНКА.

У тэму

Старшыня Гомельскага раённага Савета дэпутатаў Вікторыя ЛАДУЦЬКА:

— Тэрыторыя аднаго з найбольш буйных сельгаспрадпрыемстваў «СлаўМол» ахоплівае вельмі значныя па плошчы тры сельсаветы Гомельскага раёна — Цярэніцкі, Аздзелінскі і Бальшавіцкі. Вельмі важна, што маладому кіраўніку УСП «СлаўМол», ураджэнцу нашага раёна Ігару Сцяпанаву ўдалося ўстанавіць цеснае ўзаемадзеянне, адносіны павагі і падтрымкі з кіраўнікамі ўсіх трох сельвыканкамаў. Так, любое пытанне, якое датычыцца жыхароў населеных пунктаў, тэрыторыі сельсаветаў, дырэктар гаспадаркі абавязкова дапамагае аператыўна вырашыць. Яго неабыякавасць да клопату працаўнікоў-вяскоўцаў, якасці жыцця ў сельскіх населеных пунктах адзначаюць і самі людзі, і прадстаўнікі мясцовых органаў улады, дэпутаты сельсаветаў. Шчыра ўдзячны за такую жыццёвую пазіцыю кіраўніку сельгаспрадпрыемства і Гомельскі раённы Савет дэпутатаў.

Дарагія работнікі і ветэраны гаспадаркі!

Прыміце мае самые сардэчныя віншаванні з прафесійным святам —

ДНЁМ РАБОТНІКАЎ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ І ПЕРАПРАЦОЎЧАЙ ПРАМЫСЛОВАСЦІ АПК.

Вы працуеце ў адной з найважнейшых галін нацыянальнай эканомікі, забяспечваючы харчовую бяспеку, захоўваючы годныя пазіцыі краіны на міжнародным рынку.

Выбіраючы справай усяго жыцця гэтую нялёгкую, але такую важную работу на сельскай ніве, вы па праве карыстаецеся ўсенароднай павагай, заслугоўваеце самых шчырых слоў падзякі.

Ваша стваральная любоў да роднай зямлі і нялёгкай сялянскай працы забяспечвае харчовую бяспеку Беларусі, а таксама дазваляе займаць высокія пазіцыі на найбуйнейшых міжнародных рынках.

Дзякуй вам за адданасць роднай зямлі, беражлівыя адносіны да прыродных багацця ў нашай Беларусі, вернасць традыцыям самаадданага служэння на карысць сваёй краіны.

Перакананы, што і ў далейшым, абапіраючыся на найбагацейшыя традыцыі, ААТ «Крутагор'е-Петкавічы» будзе расці і развівацца, уключаючы ў сябе ўсё самае найлепшае і перадавое.

У гэты святочны дзень жадаю вам, паважаныя работнікі і ветэраны сельскай гаспадаркі, моцнага здароўя, бадзёрасці духу, увасаблення ў жыццё ўсіх намечаных планаў і нязменна багатых ураджаяў, поспехаў і дасягненняў у справах на карысць любімай Беларусі!

З павагай, дырэктар ААТ «Крутагор'е-Петкавічы» Юрый Пятровіч КЛІМАШ.

УНП 690112875

Высокая планка якасці

Як справы на вытворчасці Ваўкавыскага ААТ «Беллакт»?

Адзіны вытворца сухога дзіцячага харчавання ў Беларусі з найчысцейшай вытворчасцю і высакаякаснай прадукцыяй, сучаснае прадпрыемства, якое ідзе ў нагу з часам, і надзейны эканамічны партнёр. Усё гэта аб Ваўкавыскім ААТ «Беллакт». Мы наведалі гэтае прадпрыемства, каб даведацца, як у іх ідуць справы і якімі навінкамі за апошні час яны парадавалі пакупнікоў.

Асы вытворчасці

У наступным годзе Ваўкавыскае ААТ «Беллакт» адсвяткуе свой 55-гадовы юбілей. Пачыналася ўсё выключна з сухога дзіцячага харчавання, аднак сёння прадпрыемства ўжо даўно выйшла за гэтыя рамкі і вырабляе больш як 200 найменняў прадукцыі не толькі для малых, але і для дарослых. Тым не менш першапачатковая накіраванасць завода накладвае пэўную адказнасць і задае планку якасці.

— Калі гаворка ідзе пра дзіцячае харчаванне, то патрабаванні, якія прад'яўляюцца да звычайных малочных прадпрыемстваў, можна памножыць на два. Таму ў нас ёсць чатыры сертыфікаваныя лабараторыі, якія аб'яднаны ў адзін выпрабавальны цэнтр, — падзяліўся **генеральны дырэктар прадпрыемства Віталь ЛУПІК.** — Мы для сябе паставілі мэту, што ўся наша прадукцыя павінна адпавядаць стандартам дзіцячага харчавання. Мы ўжо зарабілі сабе рэпутацыю завода, які ас не толькі ў дзіцячым харчаванні, але і ва ўсім астатнім.

Па словах генеральнага дырэктара, для таго каб заставацца канкурэнтаздольнымі на рынку, трэба бесперапынна развівацца і мадэрнізаваць вытворчасць, чым тут паспяхова і займаюцца.

— Сёлета мы накіравалі на гэтыя мэты ўжо каля 24 млн рублёў. Да канца года плануем затраціць усяго 26 млн рублёў. Калі мы не будзем ісці наперад, заўтра нас проста пакінуць за бортам. Таму кожны год вось прыкладна такая сума ў нас арыентуецца па бізнес-плане на мадэрнізацыю, — растлумачыў ён.

Так, на прадпрыемстве ўжо ўстаноўлена новая лінія фасоўкі сухіх прадуктаў у сучаснае пакаванне дой-пак, заканчваецца мадэрнізацыя ўчастка па вытворчасці масла з установкай новых аўтаматаў, што дазволяць пашырыць фармат масла, які выпускаецца. У перспектыве — лінія па ўпакоўцы дзіцячага харчавання ў бляшаны слоік, што дазволіць прадпрыемству пашырыць геаграфію пастаўкі сухога дзіцячага харчавання. Аднак самы грандыёзны і значны для нашай краіны праект, які плануюць пачаць сёлета, — гэта будаўніцтва цэха сухога дзіцячага харчавання па стандарце GMP.

Дзякуючы ўменню ісці ў нагу з часам прадпрыемства лічыцца стабільна прыбытковым. Так, **намеснік генеральнага дырэктара па эканоміцы Наталля КУРЭЦКАЯ** падзялілася, што за дзесяць месяцаў бягучага года аб'ём вытворчасці прамысловай прадукцыі па індэксе фізічнага аб'ёму павялічаны на 6,8 % пры заданні росту на 6,5 %.

— Аб'ём экспарту тавараў у нас павялічаны ў гэтым годзе да ўзроўню мінулага года на 26,9 % пры заданні росту на 6,5 %. Такім чынам, на экспарт мы адгрузілі прадукцыю на суму каля 87 млн долараў, — дадала яна.

Такія вынікі, вядома ж, станоўча адбіваюцца і на заработнай плаце супрацоўнікаў, якая за дзевяць месяцаў выраслa на 24,5 % да ўзроўню мінулага года.

Паважаныя калегі і ветэраны працы, віншую вас

З ДНЁМ РАБОТНІКАЎ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ І ПЕРАПРАЦОЎЧАЙ ПРАМЫСЛОВАСЦІ АПК!

Менавіта дзякуючы вашай нялёгкай і карпатлівай працы нашае прадпрыемства змагло дасягнуць выдатных вынікаў. Жадаю вам ад усёй душы моцнага здароўя, сямейнай утульнасці, лёгкіх перагавораў з партнёрамі, добрай атмасферы ў калектыве, матэрыяльнага дабрабыту і ўсяго самага найлепшага.

Генеральны дырэктар Ваўкавыскага ААТ «Беллакт» Віталь ЛУПІК.

Кансервавы цэх.

Новыя смачнасці

Штогод «Беллакт» выпускае ад 35 да 50 навінак. Чым жа парадуюць у хуткім часе?

Галоўны тэхнолаг Таццяна НОВІКАВА расказала, што ўжо ў снежні ў продажы з'явяцца напіткі сухія малочныя для студэнтаў і для людзей сярэдняга і пажылога ўзросту пад гандлёвай маркай **Genetika.**

— Гэта сухая сумесь, якая будзе расфасаваная ў шматслойныя пакеты тыпу «дой-пак». Сам прадукт узбагачаны вітамінамі, мінераламі. У састаў напою ўваходзіць таксама рыбны тлушч. У комплексе сам прадукт — гэта паляпшэнне імунітэту, узбагачэнне вітамінамі, паколькі ні для каго не сакрэт, што вітамінаў мы прымаем недастаткова, — адзначыла яна. — Для людзей сярэдняга і пажылога ўзросту мы ў гэты склад яшчэ дадалі біфідабактэрыі, якія спрыяюць умацаванню імунітэту і станаўленню здаровай кішачнай мікрафлоры. Даказана, што мікрабіёта чалавека мае вельмі вялікі ўплыў на яго фізічны стан, эмацыянальны стан, таму вырашаць праблемы са страваваннем важна.

На пакаванні прадукту будзе напісана, колькі якога кампаненту чалавек ужыве ад сутачнага запатрабавання, што рэкамендуецца, выпіўшы, дапусцім адну порцыю напою. Па факце гэта будзе альтэрнатыва малаку. Пакуль у продажы з'явіцца чысты прадукт без розных густаў, аднак калі ён пачне карыстацца попытам, то асартымент будзе абавязкова пашыраць.

Што да навінак, якія ўжо з'явіліся на прылаўках крам, то тут таксама ёсць шмат усяго цікавага.

— У нас пашырылася лінейка тварожнай прадукцыі. Так, мы пакуль што адзіныя ў Беларусі выпусцілі на рынак **тварожныя палачкі «Пікнічок»** з рознымі густамі: грыбоў, італьянскіх траў, крэветак, — падзялілася Таццяна Новікава. — Такі прадукт можа служыць альтэрнатывай перакусу для тых, хто не любіць салодкае. Таксама яго можна выкарыстоўваць пры падрыхтоўцы страў і закусак.

Акрамя таго, аднавілася вытворчасць прадукту тварожнага з макам і жэле. Таго самага дэсерту з суцэльнымі жэлацінавымі мішкамі. Таксама з'явіліся два новыя віды **«шакаладнай каўбасы»** — з разынкамі і з какосавым напаўняльнікам, пашырылася лінейка ўсімі любімай **дэсертнай пасты «Choco Loco»** новымі густамі — карамельна-сметанковым і какосавым.

— Яшчэ мы пайшлі на не зусім уласцівую нам нішу. Зрабіўшы аналіз рынку хуткараствараль-ных кававых напояў, мы вырашылі стварыць нешта сваё натуральнае без кансервантаў і фарбавальнікаў. Так атрымалася **лінейка хуткараствараль-ных напояў «3 у 1» і «4 у 1» пад гандлёвай маркай «CoffeMil» і какава-напой «Choco Loco»,** — расказала галоўны тэхнолаг.

Таксама «Беллакт» упершыню паспрабаваў зрабіць сухія кашы для дарослых.

— Мы пазіцыянуем сябе заўсёды як завод дзіцячага харчавання, але ўсё ж такі вырашылі пайсці і ў гэтую нішу. Так з'явіліся два прадукты: безмалочная каша з манга для тых, хто не пераносіць малако, і малочная каша з клубнікай і персікам, — адзначыла Таццяна Новікава.

Для прадпрыемства вельмі важная зваротная сувязь з пакупніком. Таму, калі было выказана, што стаграмовы дэсерт на вафлі для кагосьці занадта вялікі, «Беллакт» выпусціў пяцідзесяціграмовы дэсерт на маленькай вафлі ў якасці альтэрнатывы.

— Яшчэ ў нас ёсць **дэсерт пад гандлёвай маркай «Fit»** для тых, хто сочыць за сваім харчаваннем. Ён можа быць як на печыве, так і на вафлі, але з паніжаным утрыманнем цукру і з паніжаным утрыманнем тлушчу. І пры гэтым смакавыя якасці вось менавіта дэсерту ў ім захаваны разам з далікатнай кансістэнцыяй тварагу, — падзялілася галоўны тэхнолаг.

Планаў на будучыню — шмат! Адзін з іх — зрабіць уласнае мяккае марожанае ў выглядзе сухой сумесі, якую можна будзе купіць, узбіць дома, замарозіць і атрымаць смачнае і карыснае «беллактаўскае» марожанае.

Стэнд прадпрыемства на «Прадэкспа-2024» у Мінску.

Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

Усходні кірунак

Каля паловы прадукцыі прадпрыемства адпраўляецца на экспарт у больш як 20 краін свету, сярод якіх Расія, Малдова, Казахстан, Кітай, Егіпет. З вялікай зацікаўленасцю «Беллакт» адносіцца да рынкаў усходніх краін з высокім узроўнем нараджальнасці і добрай плацежаздольнасцю насельніцтва.

— Над геаграфіяй працуе аддзел знешнеэканамічнай дзейнасці. У пачатку года вызначаем стратэгію, куды мы жадаем выйсці, вызначаем адказных адмыслоўцаў і працуем сумесна над тым, каб трапіць туды. Адзін з самых эфектыўных інструментаў для пошуку кліента — гэта ўдзел у міжнародных выставах, — падзяліўся **намеснік генеральнага дырэктара па камерцыйных пытаннях Іван ЛУПІШ.**

У гэтым годзе «Беллакт» выязджаў са сваёй прадукцыяй у Кітай і Турцыю. А ў лістападзе браў удзел у выстаўцы «Прадэкспа-2024» у Мінску.

— Плануюцца выставы ў Егіпце і ў Амане ў пачатку снежня. У Аман мы ляцім першы раз, а ў Егіпце ўжо будзем удзельнічаць паўторна, — адзначыў Іван Лупіш.

Паводле яго слоў, новая краіна — заўсёды вялікая праца. Гэта мноства юрыдычных і эканамічных момантаў, пераклады этыкетак, арганізацыя прэзентацыйнай рэкламнай прадукцыі і выставак.

— Мы да кожнай краіны падыходзім вельмі старанна, асабліва калі мы гаворым пра дзіцячае харчаванне. Некаторыя прад'яўляюць адмысловыя патрабаванні да саставу. Тады нашы тэхнолагі дапрацоўваюць прадукты пад тую ці іншую краіну, — падзяліўся намеснік генеральнага дырэктара па камерцыйных пытаннях.

Вынікі карпатлівай працы не прымушаюць сябе чакаць. Кожны год спіс знешнеэканамічных партнёраў прадпрыемства стабільна папаўняецца новымі краінамі.

Людзі — на вагу золата

Купіць магчыма шмат чаго: добрае абсталяванне, новыя тэхналогіі, але людзей, якія сапраўды разумеюць спецыфіку дзіцячага харчавання, па пальцах можна пералічыць, таму яны на вагу золата. Такую думку выказаў генеральны дырэктар прадпрыемства Віталь Лупік.

Менавіта таму «Беллакт» славіцца не толькі якаснай прадукцыяй, але і высокім узроўнем клопату аб сваіх супрацоўніках.

— Насамрэч сацыяльны пакет на прадпрыемстве вельмі добры. Наш калектыўны дагавор максімальна накіраваны на падтрымку персаналу. Ёсць свой ФАК і медыцынскі пункт са стаматалогіяй і працэдурным кабінетам. Дапамагаем матэрыяльна не толькі работнікам, але і ветэранам, — падзяліўся Віталь Лупік.

— Нашы людзі вельмі добра працуюць, таму могуць і добра адпачываць, — заявіў **старшыня прафсаюзнага камітэта Уладзімір НІЧЫПАР.** — Мы даём пуцёўкі ў розныя санаторыі. Да таго ж у нас ёсць асабістая база адпачынку «Волпа», дзе людзі могуць улетку арандаваць домікі.

Таксама «Беллакт» рэгулярна арганізоўвае турыстычныя паездкі для работнікаў і іх сем'яў. Для гэтых мэт нават вырашылі купіць спецыяльны аўтобус.

— Спрабуем сумясціць нашы паездкі з наведваннем помнікаў, ускладаем кветкі і вянкі. Важна, каб усё гэта мела долю патрыятычнага выхавання, — дапоўніў генеральны дырэктар.

Вялікая ўвага ўдзяляецца і розным спартыўным спаборніцтвам. Так, нядаўна на базе прадпрыемства прайшлі раённыя спаборніцтвы «Тата, мама, я — спартыўная сям'я», у якіх супрацоўнік «Беллакта» Дзмітрый Ламан з сям'ёй занялі 2-е месца.

Зусім нядаўна тут адсвяткавалі прафесійнае свята. І падрыхтоўка да яго, вядома, была на ўзроўні. Увесь канцэрт арганізавалі поўнасцю сваімі творчымі калектывамі. А ўзнагародзілі ганаровымі граматамі ажно звыш 140 чалавек!

Каб увайсці ў рады «беллактаўцаў», трэба прайсці няпросты шлях. Так, на падрыхтоўку новага спецыяліста патрабуецца каля дзевяці месяцаў. Аднак прадпрыемства заўсёды адкрытае да супрацоўніцтва. Напрыклад, у сярэдзіне лістапада сюды на практыку прыйшло каля дзесяці студэнтаў з Гродзенскага дзяржаўнага аграрнага ўніверсітэта.

— Для таго каб студэнты разумелі спецыфіку працы на харчовым прадпрыемстве, яны павінны прайсці праз усё гэта самі. Каля месяца будуць працаваць у нас на розных пасадах, а мы будзем да іх прыглядацца. Так да моманту іх размеркавання мы ўжо будзем разумець, хто на што здольны, — заключыў Віталь Лупік.

УНП 500043083

Лізавета ГОЛАД, фота аўтара і з архіва прадпрыемства.

Калектыў гаспадаркі. *Злева направа:* касір Святлана КУПРАКОВА, спецыяліст аддзела кадраў Вольга ВУСІК, намеснік галоўнага бухгалтара Вера ЗУБІК, бухгалтар Наталля ТАРАЗЕВІЧ, юрыст-кансультант Таццяна ШЧАРБЯНЮК, спецыяліст па закупках Вікторыя КАРУНАС, сакратар Любоў ЯСКОВІЧ, бухгалтар Святлана ПЯТРУЧЫК, бухгалтар Антаніна КАЗЛОЎСКАЯ, дырэктар Аляксандр МАРКЕЧКА, галоўны эканаміст Валянціна ШЭШКА, дыспетчар Наталля МАРКЕЧКА, галоўны бухгалтар Марына БЕЛІКАВА, бухгалтар Алена ДАНІЛЮК, заатэхнік Марына ПАЗНЯК, намеснік дырэктара Уладзімір АСІПЧУК.

«МУРАВА» МОЦНАЯ ТРАДЫЦЫЯМІ

Працоўныя будні гаспадаркі, дзе развіваюць вытворчасць, разлічваюць на ўласныя сілы і жывуць па сродках

Фота Алены ДАЎЖАНОК.

Наведаць даўняга сябра «Звязды» — адкрытае акцыянернае таварыства «Мурава» — у нас гэтым разам было, як мінімум, дзве нагоды. Першая — павіншаваць яго калектыў з надыходзячым святам — Днём работнікаў сельскай гаспадаркі. А другая — пазнаёміцца з новымі людзьмі: у «Мураве» ў гэтым годзе адбылося значнае кадравае абнаўленне, звязанае са зменай пакаленняў. Шэраг працаўнікоў кіруючага звяна пайшлі на заслужаны адпачынак, а на іх месца прыйшлі новыя, маладыя кадры. Але ж галоўнае, што нас, несумненна, парадавала, — да традыцый, напрацовак сваіх папярэднікаў тут ставяцца з нязменнай павагай.

Усе новыя — свае

У маі гэтага года сельгаспрадпрыемства ўзначаліў **Аляксандр МАРКЕЧКА**. Да гэтага Аляксандр Іванавіч сем гадоў працаваў намеснікам дырэктара гаспадаркі. Біяграфія Аляксандра Маркечкі ўяўляе сабой прыклад таго, як кіраўніка з маладога спецыяліста вырасцілі на сваім прадпрыемстве. Нарадзіўся і вырас у Мураве, тут скончыў сярэднюю школу, паступіў у Брэсцкі інжынерна-будаўнічы інстытут, цяпер Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт. Пасля заканчэння ВНУ прыйшоў на работу ў сваю гаспадарку, працаваў на розных пасадах, пакуль не ўзначаліў яе.

Галоўным інжынерам сельгаспрадпрыемства некалькі месяцаў таму прызначаны **Аляксандр КАРУНАС**. Апошні таксама нарадзіўся і вырас у Мураве. Машынны двор ведае з малодшых класаў, бо і малым прыбягаў сюды да бацькі, начальніка мехатрада. Першую адукацыю атрымаў у Пружанскім аграрным каледжы і адразу прыйшоў на работу ў сваю гаспадарку. Затым, пасля службы ў арміі, вывучыўся на інжынера ў Горкаўскай сельгасакадэміі, цяпер, дарэчы, без адрыву ад вытворчасці вучыцца там на эканамічным факультэце. Жонка Аляксандра — настаўніца, сям'я ўжо мае траіх дзяцей. Гаспадарка выдзеліла для сям'і дом. «Ёсць усе магчымасці для самарэалізацыі, для прафесійнага росту, для камфортнага жыцця. У сельскай гаспадарцы таксама трэба некаму працаваць», — сказаў Аляксандр у нашай гутарцы.

Аднакласніца Аляксандра — Марына Белікава — сёлета заняла пасаду галоўнага бухгалтара адкрытага акцыянернага таварыства. У 2016 годзе Марына Алегаўна скончыла Палескі дзяржаўны ўніверсітэт. Усёй душой імкнулася на малую радзіму. Сюды і мужа з Пінска прывезла. Спачатку Марына пайшла працаваць тэхнікам па племуліку на жывёлагадоўчы комплекс. Потым перайшла ў кантору, папрацавала спецыялістам па закупках, на іншых пасадах — адным словам, гаспадарку вывучыла з розных бакоў. Сельгаспрадпрыемства выдзеліла дом маладой сям'і, цяпер яны з мужам гадуюць дачушку. «Работа па маёй спецыяльнасці, работа мне падабаецца, калектыў добра знаёмы», — сказала Марына Белікава.

Вельмі хораша адазвалася пра калектыў гаспадаркі новы **галоўны заатэхнік «Муравы» Марына ПАЗНЯК**. Раней Марына Іванаўна працавала ў другім сельгаспрадпрыемстве, сюды прыйшла па запрашэнні кіраўніцтва літаральна паўтара месяца таму. «Гаспадарка невялікая, кампактная, дойнае пагалоўе налічвае крыху больш за 1600 галоў. Удоі нават вельмі нядрэнныя, як і іншыя паказчыкі, але ж рэзервы для далейшага развіцця ёсць, — спадзяецца Марына Пазняк. — Перавагай работы ў «Мураве» з'яўляецца тое, што тут усяго тры жывёлагадоўчыя аб'екты. Так што за дзень удаецца пабываць на кожным, а то і не адзін раз. Асноўныя кірункі рабочай праграмы на найбліжэйшы час акрэслены: здароўе жывёлы, захаванасць пагалоўя, павышэнне ўдояў. Давядзецца шчыльна працаваць з генетыкай. Настрой на работу добры, таму што калектыў згуртаваны, кампетэнтныя спецыялісты, умовы працы належныя».

Галоўныя прынцыпы гаспадарання

Амаль усе, з кім у гэты дзень давялося гаварыць у Мураве, не прамінулі добрым словам згадаць яе былога кіраўніка — Пятра Мікалаевіча Білецкага, які больш чым 35 гадоў кіраваў сельгаспрадпрыемствам. Менавіта яго падыходы і прынцыпы гаспадарання трымаюць сельгаспрадпрыемства на плаву многія гады. Развіваць і ўдасканальваць маюць намер і паслядоўнікі.

Урачыстыя провады на пенсію мінулага дырэктара гаспадаркі Пятра БІЛЕЦКАГА.

Некалькі гадоў таму мы гаварылі з Пятром Білецкім пра перамены, якія адбываліся на працягу чатырох дзесяцігоддзяў яго працоўнай дзейнасці: «З той пары змянілася ўсё ў сельскагаспадарчай вытворчасці, — казаў Пётр Мікалаевіч. — На службу аграрыям прыйшлі новыя тэхніка і тэхналогіі. У вачах сучаснага чалавека не проста цяжкай, ледзь не катаржнай працай выглядае тагачасная ўборка і апрацоўка лёну, уборка буракоў альбо нават нарыхтоўка кармоў. Менш за паўстагоддзя таму гэтая работа патрабавала шмат чалавечай сілы, а цяпер усё робяць машыны і трактары. І на ферме работа стала зусім іншай — не сказаць што лёгкай, але іншай. Там пануюць новыя тэхналогіі ўтрымання статка. Зноў жа на службу чалавеку прыйшла тэхніка. Ну а калгасны машынна-трактарны парк XXI стагоддзя падразумявае наяўнасць адукаваных кіроўцаў, бо высокапрадукцыйная тэхніка ў асноўным камп'ютарызаваная. Але ж нязменным застаецца адно — сумленнасць працаўніка, шчырасць у адносінах да зямлі, бо яе, зямлю, не падманеш. Недзе не дагледзеў, прапусціў, махнуў рукой, потым яно абавязкова вылезе, і не толькі стратай ураджаю ў канкрэтны сезон, але і пазней: агрэхі ў тэхналогіі пацягнуць за сабой цэлы ланцужок праблем. А на выпраўленне памылкі спатрэбіцца ўжо не адзін сезон, а магчыма, некалькі. І яшчэ ў чым пераканаўся за многія гады на ўласным вопыце, — працягваў Пётр Мікалаевіч, — у важнасці дакладнага фінансавага разліку і жыцця па сродках. Асабліва цяпер, ва ўмовах рынкавай эканомікі, павелічэння тэмпаў жыцця наогул. Пралічыць, каб не трапіць у фінансавую кабалу, выглядае гарантыяй эканамічнага дабрабыту і стабільнасці. Мы заўсёды разлічвалі толькі на ўласныя сілы, таму ніколі не мелі запазычанасці па выплаце заработнай платы і пагашэнні крэдытаў. Мы бяром крэдыт толькі тады, калі дакладна праглядаюцца механізмы і магчымасці яго пагашэння», — гаварыў шаноўны аграрый.

Сумленнасць у адносінах да зямлі і да любой працы ў любым падраздзяленні, дакладны эканамічны разлік і цяпер лічацца галоўнымі прынцыпамі гаспадарання, паводле слоў дырэктара адкрытага акцыянернага таварыства Аляксандра Маркечкі.

ААТ «Мурава» займаецца вытворчасцю элітнага насення збожжавых культур, цукровых буракоў, алейнага насення рапсу, а таксама малака і, адпаведна, кармоў. Гаспадарка дакладна рэагуе на патрабаванні рынку, тут укараняюць новыя тэхналогіі, развіваюць новыя вытворчасці.

— Працягваем купляць новую тэхніку, абнаўляем парк. У тэхнічным парку стаўку робім на тэхабслугоўванне машын і механізмаў, — адзначае дырэктар гаспадаркі. — Належнае і якаснае тэхабслугоўванне — самы танны і надзейны спосаб утрымання тэхнікі. Сэканоміш на гэтым — страціш на бясконцых пакупках запчастак. Ды і больш праслужыць любая машына, калі яе глядзець па-гаспадарску.

— Працягнем будаўніцтва, — расказвае кіраўнік. — Вось толькі нядаўна атрымалі гатовы праект на ўзвядзенне новай сянажнай траншэі. На стадыі распрацоўкі знаходзіцца праект будаўніцтва памяшкання для ўтрымання маладняку на жывёлагадоўчым комплексе. Для поўнага цыкла выгадоўвання — ад маленькага цяляці да каровы — у нас не хапае аднаго будынка. У наступным годзе плануем такое будаўніцтва.

Дырэктар Аляксандр МАРКЕЧКА.

У гаспадарцы многае робіцца сваімі сіламі. Ёсць будаўнічая брыгада, калі трэба абставіць склад, адрыну для сена, зрабіць вароты альбо лаўкі каля фермы, правесці афармленне таго ці іншага аб'екта, тут спраўляюцца самастойна. Бо прыцягнуць да ўказанай работы стараннюю спецыялізаваную арганізацыю абыдзецца ў разы даражэй.

Інжэнеру механізацыі жывёлагадоўчых ферм Мікалаю КАЗЛОЎСКАМУ ўручаецца грамата за добрасумленную працу да яго 65-годдзя.

Інжынерная служба гаспадаркі заўсёды працуе на якасць. *Злева направа:* загадчык майстэрняў Віталь БЕРАЗНЮК, галоўны інжынер Аляксандр КАРУНАС, начальнік мехатрада Уладзімір КАРУНАС, загадчык машыннага двара Мікалай ПЕКУН.

Цэх механізацыі

Цэх механізацыі з'яўляецца бадай што адным з самых затратных падраздзяленняў сельгаспрадпрыемства. Тэхніка сёння каштуе нятанна. Але ж менавіта тэхніка забяспечвае ўвесь тэхналагічны працэс на палях, фермах, іншых вытворчых пляцоўках.

Парадак у падраздзяленні пачынаецца з парадку на машынным двары і навакольнай тэрыторыі. За апошнія гады знешні выгляд тут змяніўся да непазнавальнасці. Добраўпарадкаванне, паляпшэнне праводзіцца пастаянна. Вось і цяпер вядзецца ўкладка бетоннай пляцоўкі для рамонту і знаходжання сельгасмашын. А ў рамонтнай майстэрні 1978 года пабудовы светла, прасторна, дагледжанасць адчуваецца ва ўсім.

Галоўны інжынер Аляксандр Карунас расказвае, што для працаўнікоў цэха механізацыі створаны належныя ўмовы, у майстэрні ёсць пакой адпачынку, пакой для прыёму ежы. Калектыў гэтага падраздзялення налічвае каля шасці дзясяткаў чалавек.

— Вытворчымі задачамі інжынернай службы з'яўляецца грунтоўны рамонт, прафілактыка і абслугоўванне тэхнікі. З заканчэннем уборкі пачынаецца рамонтны сезон, — заўважае галоўны інжынер. — Ёсць планы-графікі работы, сфарміраваны два звяны, адно будзе займацца рамонтам сельгасмашын без рухавікоў, другое на чале з майстрам-наладчыкам рамантуе машыны з рухавікамі, трактары, камбайны, іншыя машыны. У нас тэхніка добра рыхтуецца, той жа камбайн фактычна поўнасцю разбіраюць, каб правесці не толькі рамонт, але і прафілактыку.

Традыцыйна ў «Мураве» стаўку робяць на пастаяннае і якаснае тэхнічнае абслугоўванне. Ставіць тэхніку на рамонт пасля заканчэння сезонных работ, а да гэтага эксплуатаваць яе напоўніцу — тут лічаць даўно састарэлай і заганнай практыкай. Тэхнічнае абслугоўванне праводзіцца строга па ўліку мотагадзін. Прайшоў агрэгат пэўную колькасць гадзін — становіцца на абслугоўванне. Сваімі майстрамі тутэйшы машынны двор можа пахваліцца. Захавалі і кузню. Яны, кузні, ужо мала дзе засталіся, а тут не выкідаюць старое абсталяванне, і яно вельмі часта выручае, калі трэба выкаваць дэталь нават да прасцейшай прылады. Не даводзіцца недзе замаўляць і плаціць за гэта вялікія грошы. У вольны час кавалі, бывае, робяць, як той казаў, для душы розныя рэчы, якія потым служаць упрыгажэннем у тым ліку двара майстэрні.

Камбайнер Мікалай БУЛЬЧУК працуе на ўборцы буракоў.

Новы кормаўборачны камбайн гаспадаркі.



Добраўпарадкаванне тэрыторыі рамонтных майстэрняў.

На бураковай плантацыі

З Аляксандрам Іванавічам выязджаем на поле. «Цяпер вядзецца ворыва, пад'ём зяблева, унясенне арганікі, — каментуе дырэктар. — Застаюцца апошнія гектары цукровых буракоў. Усяго бураковая плантацыя займала ў гэтым годзе 250 гектараў. Атрымліваем у сярэднім па 500 цэнтнераў з гектара. Ураджай мог бы быць і большы, але засушлівы пачатак лета крыху перашкодзіў росту раслін. І ўсё ж вытворчасць гэтай культуры ідзе з прыбыткам. Цукровы завод прымае ўраджай з разліку — тона за тону, бо караняплоды паказалі добрую цукрыстасць.

Усю плантацыю буракоў убіраюць два чалавекі. Адзін на камбайне капае караняплоды, а другі на пагрузчыку дачышчае і загружае ў машыну, якая адвозіць ураджай на завод.

Механізатар Яўген УЛЕЗЛА на пагрузцы буракоў.

Мікалай Бульчук — якраз той механізатар, які выкопвае буракі. А яшчэ ён высакакласны спецыяліст і ветэран калгаснай працы. Родам з суседняй вёскі, у школе вучыўся ў Мураве. Пасля службы ў ВМФ вярнуўся ў сваю гаспадарку, сеў на трактар і вось ужо 38 гадоў шчыруе.

Як удалося даведацца, Мікалай Уладзіміравіч не проста майстар земляробскай справы, а такі спецыяліст, роўных якому пашукаць. Шмат гадоў у жніво Мікалай Бульчук сядае на камбайн і ўбірае хлеб. Калі збажына сабраная, пераходзіць на буракаўборачны камбайн, потым працуе на іншых трактарах, такіх як «Амкадор». Яму любую тэхніку можна даверыць.

Дом атрымаў у свой час у гаспадарцы, выкупілі яго з жонкай, прыватызавалі. Трымаюць невялікую падсобную гаспадарку — як жа без гэтага ў вёсцы? Гаворыць, што жыць у іх можна, зарплата прыстойная, праведзены газ, дом добраўпарадкаваны, з усімі выгодамі.

На другім полі знаёмімся з механізатарам Яўгенам Улезла, які дачышчае буракі і загружае іх у машыны. Яўген Улезла — працаўнік малады. Адслужыў у войску, вярнуўся ў сваю гаспадарку, месяц таму ажаніўся, ужо атрымаў дом. «Ніколі нават не думаў пра горад. Прыроду люблю, прастор. А работы не баюся. Выхадных летам амаль не бывае, а калі будуць выпадаць увосень, зімой альбо ў водпуск дамовіліся з жонкай выязджаць у горад, можа, і падарожнічаць будзем, каб паглядзець цікавыя мясціны. Для жыцця ж і ў нас усё ёсць», — кажа механізатар.

Размова заходзіць пра кадры. Аляксандр Маркечка адзначае, што ў сваім калектыве яны асабліва цэняць ветэранаў вытворчасці, стараюцца падтрымаць маладых спецыялістаў. Вось і ў дзень нашага прыезду з 65-годдзем урачыста віншавалі інжынера механізацыі жывёлагадоўлі Мікалая Казлоўскага. «Можна, вядома, прыехаць, адпрацаваць вызначаны тэрмін і з'ехаць. А тыя, хто застаецца, выбіраюць не толькі работу, але і ўклад жыцця, — разважае Аляксандр Іванавіч. — Каб застацца ў вёсцы, трэба яе адчуць, палюбіць, як ні пафасна гэта гучыць. Вось, скажам, начальнік вытворчага ўчастка Анатоль Сахарчук. Работы ў яго на вытворчасці хапае. Але ў чалавека ёсць хобі, ён займаецца вывучэннем гісторыі свайго краю, знаходзіць звесткі нават аб далёкім мінулым. Гэта ён адшукаў пісьмовыя згадкі пра Мураву, датаваныя 1563 годам. Не так даўно мы паставілі валун з гэтай датай, каб усе ведалі, што Мураве ўжо 460 гадоў, што і раней у нашай вёсцы жылі людзі, расцілі хлеб, гадавалі дзяцей. А мы — іх нашчадкі».

Святлана ЯСКЕВІЧ, Алена ДАЎЖАНОК, Лізавета ГОЛАД (фота).

УНП 200027333

БЕЛАРУСБАНК

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА по продаже капитального строения

Организатор торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества – Могилевское областное управление № 700 ОАО «АСБ Беларусбанк»

Наименование объекта продажи	**Капитальное строение с инвентарным номером 724/С-11515, расположенное по адресу: Могилевская область, г. Чаусы, ул. Советская, 9/1, общей площадью 167,0 кв. м, год постройки – 1996**
Начальная цена продажи	21960,00 руб. (двадцать одна тысяча девятьсот шестьдесят рублей 00 копеек), в т. ч. НДС 20 % – 3660,00 (три тысячи шестьсот шестьдесят рублей 00 копеек)
Сумма задатка	1098,00 руб. (одна тысяча девяносто восемь рублей 00 копеек) – 5 % от начальной цены продажи
Открытый аукцион состоится	**19.12.2024 в 11.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, д. 71А-2, первый этаж, актовый зал**
Заявления и документы на участие принимаются	В рабочие дни с 9.00 до 16.00 по 18.12.2024 включительно по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 71А-2, 5-й этаж, кабинет 502
Продавец	ОАО «АСБ Беларусбанк». Договор купли-продажи заключается ОАО «АСБ Беларусбанк» (г. Минск) и регистрируется в органе по государственной регистрации
Контактные данные	По вопросам, связанным с объектом продажи, обращаться по телефонам: тел.: (8 0222) 752155, моб. 8029-169-39-68

Для участия в открытом аукционе предоставляется заявление, к которому прилагается документ с отметкой банка, подтверждающий внесение суммы задатка в размере 1098,00 бел. руб. на счет № BY69AKBB 66708597000020000000 БИК AKBBBY2X в ОАО «АСБ Беларусбанк», УНП 100325912.

К заявлению также прилагаются:

юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования, а также копии учредительных документов юридического лица;

иностранным юридическим лицом – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданной обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на русский или белорусский язык;

гражданином Республики Беларусь – копия паспорта (стр. 25, 31, 33);

иностранным гражданином или лицом без гражданства – документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально заверенным переводом на русский или белорусский язык;

представителем заявителя (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) – доверенность, выданная в установленном порядке.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством).

Нярэдкія выпадкі пераезду жыхароў ЗША ў нашу краіну. Так, амерыканец пасля 26 гадоў службы ў ВПС ЗША пераехаў разам з сям'ёй на пастаяннае месца жыхарства ў Беларусь, палюбіў яе ўсім сэрцам і называе сваім домам. «Я сапраўды аддаю перавагу Беларусі, а не Злучаным Штатам. Мой дом там, дзе сэрца, а маё сэрца жыве ў Беларусі. Я люблю Беларусь, Беларусь — мой дом, тут жыве мая сям'я», — адзначыў БелТА амерыканец, які перабраўся ў Мінскую вобласць у 2016 годзе.

Крыс вельмі рады, што ў Калодзішчах, дзе ён цяпер жыве, да яго ўсе ставяцца па-сяброўску і не ўспрымаюць як чужынца. «Беларускія людзі неверагодна гасцінныя і прыязныя, — кажа ён аб сваіх уражаннях. — Я вельмі дрэнна ведаю рускую мову, майго слоўнікавага запасу не хапае, каб нармальна мець зносіны, але я ўсё роўна адчуваю прыязнае стаўленне. Усе вельмі ветлівыя, не толькі дзеці. Здаецца, што прыязнасць гэтак жа натуральна для беларусаў, як і любоў да прыроды».

Амерыканец прызнаецца, што шмат даведаўся пра Беларусь, якая выклікае ў яго толькі станоўчыя эмоцыі. Гэта датычыцца многіх аспектаў жыццядзейнасці і ў першую чаргу сацыяльнай сферы, якая робіць аднолькава камфортным жыццё як у вялікіх гарадах, так і на перыферыі. Напрыклад, грамадскі транспарт — немалаважны аспект для жыхароў раёна: «Мы можам дабрацца ў Мінск на электрычцы і аўтобусе ў любы час, калі захочам. У Злучаных Штатах няма нармальнага грамадскага транспарту. Мы жылі ў аддаленым раёне, і мая жонка называла яго «залатой клеткай», бо яна не магла нікуды выехаць нават за ежай, паколькі ў яе не было правоў кіроўцы».

Сям'я Крыса вярнулася ў Беларусь у 2012 годзе. Ён таксама хацеў быць разам з ёй, аднак не змог адразу прадаць свой дом. У выніку расстанне зацягнулася на доўгія чатыры гады, а дом прыйшлося прадаць з вялікай стратай. Амерыканец прызнаецца, што проста страціў гэтыя грошы, бо гэтая нерухомасць на самай справе каштавала як мінімум у два разы даражэй. «Людзі думаюць, што амерыканцы вельмі багатыя, у іх ёсць сваё жыллё. Я ўклаў у дом усе свае зберажэнні. Пры гэтым мне яшчэ прыйшлося заняць грошы ў банку, каб аплаціць яго пакупку. Пасля я паспрабаваў прадаць свой дом, але не змог адбіць укладзеныя грошы», — растлумачыў ён.

Крыс працягвае здзіўляцца, наколькі Беларусь камфортная для жыцця, і гэта ў тым ліку датычыцца бяспекі людзей: «Я рэгулярна чытаю беларускія навіны і бачу, што злачыннасць тут вельмі нізкая ў параўнанні са Злучанымі Штатамі. Маю пляменніцу абрабавалі ў Нью-Ёрку на аўтобуснай станцыі проста сярод белага дня. Заснавальнік і ўладальнік Telegram Павел Дураў таксама перажыў спробу рабавання ў Сан-Францыска, калі да яго падышлі тры моцныя хлопцы ў восем гадзін вечара, каб скрасці тэлефон. І гэта адбылося з уладальнікам Telegram! Так што я адчуваю сябе ў Беларусі ў поўнай бяспецы, гэта вельмі бяспечнае месца для жыцця».

❍ Даслоўна

«Сардэчна запрашаем у Беларусь!»

Беларусь заўсёды выходзіла з важнасці канструктыўных кантактаў з ЗША, а перыяд гісторыі, калі такія кантакты пераважалі, дэманстраваў іх бясспрэчную карысць для дзвюх дзяржаў, падкрэсліў раней Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ў віншаванні народу Злучаных Штатаў Амерыкі з Днём Незалежнасці.

«Мы цэнім намаганні простых амерыканцаў, якія па-чалавечы, ад душы дапамагалі нам у барацьбе з нацызмам, пасляваенным аднаўленні краіны, пераадоленні наступстваў аварыі ва ўкраінскім Чарнобылі, — адзначаецца ў віншаванні. — Нягледзячы на палітычныя стэрэатыпы, запрашаем вас зазірнуць за гарызонт, скласці сваё асабістае ўражанне аб Беларусі, ацаніць яе дасягненні, — прапанаваў Прэзідэнт. — Упэўнены, многія будуць прыемна здзіўлены і захочуць бліжэй пазнаёміцца з нашай краінай».

Аляксандр Лукашэнка пажадаў народу ЗША бясхмарнага неба і мудрасці мірнага суіснавання з усімі людзьмі добрай волі. «Сардэчна запрашаем у Беларусь!» — адзначаецца ў віншаванні.

Захар БУРАК.

ЧЭРГІ, НАРКАТРАФІК І БЕСЧАЛАВЕЧНАЕ СТАЎЛЕННЕ ДА МІГРАНТАЎ

Што адбываецца на граніцы з ЕС?

Па словах намесніка начальніка ўпраўлення — начальніка 1-га аддзела 1-га ўпраўлення Галоўнага ўпраўлення па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі Міністэрства ўнутраных спраў Сяргея МЯЛЕШЧЫКА, аб'ём канфіскаваных псіхатропных рэчываў за студзень — верасень гэтага года вырас больш чым у чатыры разы.

Аналіз агульных звестак аб канфіскацыі на тэрыторыі Беларусі з незаконнага абароту наркотыкаў і псіхатропных рэчываў сведчыць аб тым, што аб'ём іх канфіскацыі ўсімі органамі крымінальнага пераследу вырас у 2,6 раза і склаў 1,7 тоны. Асноўны аб'ём канфіскаваны мытнымі, пагранічнымі органамі на дзяржаўнай граніцы краіны. Наркотыкі і псіхатропы фактычна транзітам рухаліся праз Беларусь. «Пры гэтым рост канфіскаваных наркотыкаў нязначны, тады як псіхатропных рэчываў канфіскавана больш чым у чатыры разы», — сказаў Сяргей Мялешчык, дадаўшы, што гаворка ідзе пра 1 тону 336,5 кілаграма.

Паводле яго слоў, гэты факт пацвярджае актуальнасць праблемы выкарыстання тэрыторыі Беларусі не толькі як рынку збыту, але і як краіны транзіту. У цэлым за дзевяць месяцаў назіраецца ўстойлівая тэндэнцыя зніжэння па такіх важных паказчыках, як колькасць выяўленых нарказлачынстваў, колькасць дастаўленняў у арганізацыі аховы здароўя ў сувязі з атручваннем наркотыкамі, а таксама смяротных перадазіровак. За гэты перыяд зарэгістравана 2908 наркатычных злачынстваў, з якіх 1450 звязаны са збытам. Устаноўлена 1576 чалавек, якія здзейснілі злачынствы ў сферы наркакантролю, з іх 590 нарказбытчыкаў.

А распаўсюджвальнікі гэтага небяспечнага «зелля» становяцца ўсё маладзейшымі. З 45 да 76 павялічылася колькасць нарказлачынстваў, учыненых непаўналетнімі або з іх удзелам. 60 такіх злачынстваў звязаны са збытам. Разам з тым захоўваецца дынаміка зніжэння колькасці смерцяў, выкліканых атручваннем наркотыкамі. За дзевяць месяцаў распачата 42 крымінальныя справы па фактах смерці ў выніку атручвання наркотыкамі 40 чалавек.

За апошні час у нашай краіне спынена 26 каналаў паставак наркотыкаў у Беларусь і транзіту праз яе тэрыторыю. У 22 выпадках наркотыкі паступалі да нас з Расіі, трох — з Польшчы, у адным — з Літвы. Пры гэтым усе каналы з краін Еўрасаюза, а іх чатыры, выяўлены ва ўзаемадзеянні з падраздзяленнямі Дзяржаўнага пагранічнага камітэта, Дзяржаўнага мытнага камітэта. Па словах прадстаўніка МУС, гэта сведчыць аб высокім узроўні ўзаемадзеяння.

У 15 з 26 выяўленых выпадкаў кур'еры наравозілі наркотыкі праз мытную граніцу ЕАЭС і дзяржграніцу Беларусі легкавым транспартам, у сямі выпадках — у ручной паклажы рэйсавымі аўтобусамі, у трох выпадках — у багажы чыгуначным транспартам, у адным выпадку — грузавым аўтатранспартам. Затрыманы 37 актыўных удзельнікаў міжнароднага нарkatрафіку, у тым ліку пяць грамадзян Расіі, адзін — Польшчы і два — Літвы.

Супрацоўнікі наркакантролю выявілі і ліквідавалі пяць падпольных наркалабараторый, дзве з якіх — з удзелам грамадзян Беларусі на тэрыторыі Расіі. Устаноўлена, што ва ўсіх выпадках прэкурсоры і лабараторнае абсталяванне набываліся фігурантамі бескантактавым спосабам на тэрыторыі Расіі, пасля пастаўляліся ў Беларусь для вырабу асабліва небяспечнага псіхатропнага рэчыва — мефедрону. Да функцыянавання лабараторыі на тэрыторыі Беларусі датычныя ў тым ліку грамадзяне Расіі. За гэты перыяд спынена дзейнасць 116 памяшканняў, спецыяльна прыстасаваных і абсталяваных для вырошчвання наркатычных раслін.

Наркапатокі перамясціліся на польскі і прыбалтыйскі напрамкі

Як паведамляе **намеснік начальніка Галоўнага ўпраўлення арганізацыі барацьбы з кантрабандай Дзяржаўнага мытнага камітэта Сяргей ДУБРОЎСКІ,** тэма барацьбы з наркатрафікам не губляе сваёй актуальнасці. Ён заўважыў, што адбылося пераарыентаванне наркапатокаў на польскі і прыбалтыйскі напрамкі. А калегі з гэтых краін ігнаруюць сумесную работу па іх спыненні. Вынік — складанасці пры ўсталяванні ўсіх міжнародных ланцужкоў паставак наркотыкаў і беспакаранасць злачынных элементаў на тэрыторыі гэтых краін.

Разам з тым у гэтай рабоце мытнікі актыўна ўзаемадзейнічаюць з іншымі праваахоўнымі органамі Беларусі, з калегамі з ЕАЭС, перш за ўсё з Федэральнай мытнай службы (ФМС) Расіі, адзначыў Сяргей Дуброўскі. Для барацьбы з наркатрафікам у пунктах пропуску праводзіцца мытны кантроль, у тым ліку з прымяненнем сістэмы аналізу і кіравання рызыкамі, а таксама выкарыстаннем службовых сабак, тэхнічных сродкаў мытнага кантролю. Па-за пунктамі пропуску мабільнымі групамі праводзяцца спецыяльныя мерапрыемствы, а таксама выкарыстоўваюцца магчымасці ажыццяўлення аператыўна-вышуковай дзейнасці.

У студзені — сакавіку спынены буйны канал паступлення псіхатропаў з тэрыторыі ЕС транзітам праз Беларусь у Расію, дзе ажыццяўлялася іх далейшае распаўсюджванне. Затрыманы грамадзяне Літвы, Расіі, Беларусі, якія маюць дачыненне да здзяйснення злачынства. Канфіскавана каля 200 кілаграмаў 4-CMC і мефедрону.

Яшчэ адзін выпадак, які дэманструе ўзаемасувязь трансгранічнага крымінальнага свету, выяўлены ў пункце пропуску «Каменны Лог» пры даглядзе грузавога аўтамабіля, у якім перамяшчалася «насенне сланечніку». Грамадзяне Малдовы ў інструментальных скрынях прычэпа спрабавалі завезці больш за 30 кілаграм гашышу. Устаноўлена, што наркотыкі прызначаліся для дастаўкі на тэрыторыю Расіі, а перадача кур'еру была запланавана ў Мінску. У выніку правядзення аператыўнай камбінацыі пры спробе перадачы названай партыі наркотыкаў затрыманы грамадзянін Расіі, які перамясціў з Расіі ў Беларусь аўтамат Калашнікава з двума магазінамі і 30 патронамі, пісталет і прыбор для бясшумнай стральбы. Зброя і боепрыпасы прызначаліся для далейшага перамяшчэння на тэрыторыю ЕС. Пасля пры правядзенні сумесных з ФМС Расіі мерапрыемстваў, у тым ліку па метадзе кантраляванай пастаўкі, устаноўлены арганізатары двайной пастаўкі наркотыкаў і зброі.

Выкарыстанне ў злачыннай дзейнасці звычайных інтэрнэт-рэсурсаў, размешчаных у адкрытай сетцы, для Беларусі не характэрна, лічыць Сяргей Мялешчык. Супрацоўнікі праваахоўных органаў ажыццяўляюць пастаянны маніторынг з'яўлення новых пранаркатычных сайтаў і аператыўна прымяняюць меры да іх блакіравання. «Так, сёлета абмежаваны доступ да 348 падобных рэсурсаў», — сказаў Сяргей Мялешчык.

Паводле яго слоў, супрацоўнікі аналітычнай разведкі сёлета спрацавалі эфектыўна. Імі спынена дзейнасць 34 інтэрнэт-крам, якія займаліся збытам наркотыкаў. Ва ўсіх выпадках абвінавачанымі прызнаваліся не шараговыя збытчыкі, а асобы, якія непасрэдна кіравалі інтэрнэт-крамамі альбо якія ўваходзяць у склад адміністрацыі злачыннага фарміравання. Асноўная маса інтэрнэт-крам па продажы наркотыкаў размяшчаецца на ценявых пляцоўках, адзначыў спецыяліст. Акрамя таго, дадаў ён, фіксаваліся выпадкі продажу наркотыкаў з выкарыстаннем месенджараў.

Праблемны транзіт

Як адзначыў **намеснік начальніка Галоўнага ўпраўлення арганізацыі мытнага кантролю Дзяржаўнага мытнага камітэта Дзмітрый КАВАЛЁЎ,** самае актуальнае пытанне на дадзены момант на граніцы — чэргі. Усе разумеюць, што іх наяўнасць залежыць ад рашэнняў ЕС. «Закрыццё пунктаў пропуску, штучнае зніжэнне прапускной здольнасці шкодзіць як эканоміцы Еўрасаюза, так і зносінам грамадзян», — сказаў Дзмітрый Кавалёў.

Ён падкрэсліў, што беларускі бок робіць усё магчымае, каб урэгуляваць гэтае пытанне. «Неаднаразова звярталіся да сумежнага боку з пытаннямі аб забеспячэнні прапускной здольнасці, аб аднаўленні работы закрытых пунктаў пропуску. Але сумежны бок нас не чуе. І сітуацыя на граніцы працягвае пагаршацца», — дадаў ён.

Так, з 1 сакавіка закрытыя пункты пропуску «Прывалка» і «Катлоўка». З 1 ліпеня забаронены ўезд на прычэпах з беларускай рэгістрацыяй, а літаральна нядаўна, з 1 лістапада, латвійскі бок забараніў уезд і перамяшчэнне па сваёй тэрыторыі аўтамабіляў з рэгістрацыяй у Беларусі. «Беларускі бок гатовы да дыялогу, прычым, хачу звярнуць увагу, адкрытага і раўнапраўнага — па гэтых пытаннях, але, яшчэ раз звяртаю ўвагу, вельмі складана з сумежным бокам цяпер узаемадзейнічаць. Яны нас не чуюць і не хочуць з намі ўзаемадзейнічаць», — сказаў Дзмітрый Кавалёў.

Паводле яго слоў, усялякую падтрымку ў гэты складаны час мытныя органы, Дзяржаўны пагранічны камітэт, іншыя кантрольныя органы імкнуцца аказаць беларускім суб'ектам гаспадарання, якія адчуваюць беспрэцэдэнтны санкцыйны ціск. Рэалізаваны механізм перагрузак. Каля граніцы ёсць спецыяльна ўстаноўленыя месцы, у якія перавозчыкі ЕС дастаўляюць свае тавары. У далейшым перавозчыкі Беларусі і Расіі гэтыя тавары забіраюць і дастаўляюць у краіны Еўразійскага эканамічнага саюза.

У спецыяльна ўстаноўленых месцах у нас магчыма размяшчэнне больш за дзве тысячы транспартных сродкаў, што дазваляе нам ажыццяўляць штосутачна больш за тысячу грузавых аперацый. Гэты механізм дазволіў падтрымаць айчынных грузаперавозчыкаў і не дазволіць манапалізаваць еўрапейскімі перавозчыкамі рынак перавозак.

Сумесна з Дзяржаўным пагранічным камітэтам, РУП «Белмытсэрвіс» праводзіцца шэраг эксперыментаў, асабліва ў зонах чакання «Брэст», «Казловічы», што дазваляе значна знізіць градус напружанасці і ў прынцыпе ліквідаваць такую доўгую чаргу, якая перыядычна ўтваралася перад гэтымі пунктамі пропуску. Сутнасць эксперымента заключаецца ў наступным: транспартны сродак заязджае ў зону чакання, а пасля рэгістрацыі можа яе пакінуць, чакаючы сваёй чаргі ў любым зручным як для перавозчыка, так і для фізічнай асобы месцы. Выклік у пункт пропуску ажыццяўляецца па званку аператара РУП «Белмытсэрвіс». Вызначаны пэўны час на прыбыццё ў пункт пропуску.

Ён заўважыў, што цяпер абстаноўка перад пунктамі пропуску на граніцы складаная. З 26 існуючых працуюць толькі пяць: два — на польскім напрамку, два — на літоўскім, адзін — на латвійскім. Прычым у гэтых пунктах пропуску сумежным бокам штучна абмяжоўваецца прапускная здольнасць, адпаведна ў зонах чакання пачынаюць назапашвацца транспартныя сродкі. Акрамя таго, Дзяржаўны мытны камітэт сумесна з РУП «Белмытсэрвіс» актыўна развіваюць зоны чакання, каб стварыць аптымальныя ўмовы для перасячэння граніцы.

Мігранты на граніцы нават гінуць

Афіцыйны прадстаўнік Дзяржпагранкамітэта Антон БЫЧКОЎСКІ лічыць, што характар дзеянняў сумежных дзяржаў ЕС у дачыненні да бежанцаў застаецца незаконным і негуманным. «Мы сутыкаемся з такімі сітуацыямі рэгулярна. Сілавое выправаджванне ажыццяўляецца праз тыя платы, якія былі ўсталяваны на дзяржграніцы. Устаноўлена больш за 980 кіламетраў такіх загарод.

Ён адзначыў, што ў платах абсталяваны праходы або брамкі, якія першапачаткова заяўляліся для міграцыі дзікіх жывёл. Разам з тым брамкі закрытыя з таго боку на замок. «Усім абсалютна відавочна, што ніхто іх адкрываць для жывёл не будзе», — сказаў афіцыйны прадстаўнік Дзяржпагранкамітэта. Паводле яго слоў, беларускія пагранічнікі ні разу не фіксавалі, каб гэтыя праходы былі выкарыстаны па заяўленым прызначэнні.

«Людзі, якія трапілі на той бок, сустракаюць агрэсіўныя, нечалавечыя адносіны. Іх б'юць, ужываючы розныя спецсродкі, гумовыя палкі. Даходзіць да збівання прыкладамі аўтаматаў, выкарыстання пярцовага газу. Пазбаўляюць, асабліва ў халодны час года, цёплай вопраткі, каб прадухіліць паўторнае праніканне на сваю тэрыторыю, і сілай выпіхваюць. Людзі атрымліваюць траўмы, такія выпадкі зафіксаваны. Ёсць крымінальныя справы ў вытворчасці Следчага камітэта, збіраецца доказная база», — дадаў Антон Бычкоўскі.

У выніку бесчалавечнага стаўлення да мігрантаў некаторыя людзі на граніцы нават гінуць. На граніцы з ЕС з 2021 года выяўлены загінулымі 60 чалавек. Больш за ўсё на ўчастку з Польшчай — 27 чалавек, з Латвіяй — 24, з Літвой — 9 чалавек.

Днямі зафіксаваны чарговы трагічны выпадак гібелі бежанца. На латвійскім участку знайшлі цела грамадзяніна Самалі. Побач з ім быў сябар, які распавёў, што яны спрабавалі трапіць на тэрыторыю Латвіі: «Сустрэлі фактычна фашысцкае, нечалавечнае стаўленне з боку праваахоўных органаў сумежнай дзяржавы».

Сяргей КУРКАЧ.

Прэм'ера

Сонца ўзыходзіць і заходзіць...

Чым сімвалічны спектакль «Палачанка» ў Тэатры юнага гледача?

Ёсць спектаклі, якія ўражваюць і западаюць у душу настолькі глыбока, што разумееш: такі твор павінен не проста ісці менавіта на гэтай сцэне, а замацавацца на ёй нават не на гады, а на дзесяцігоддзі. Такое ўражанне калісьці пакінула пастаноўка «Палачанкі» рэжысёра Андрэя Андросіка паводле п'есы Аляксея Дударава з мастацкім афармленнем Барыса Герлавана і музыкай Уладзіміра Кандрусевіча. І тое, што яе ўвасобілі ўпершыню менавіта ў Беларускім дзяржаўным акадэмічным тэатры юнага гледача, было вельмі правільна: з гісторыяй полацкай князёўны Рагнеды знаёмяцца яшчэ ў школе. Але версія даўніх падзей, якую прапанаваў Дудараў, — аўтарская. Гэта мастацкая інтэрпрэтацыя важнай і драматычнай часткі беларускай гісторыі: як магла б развівацца лінія стасункаў Рагнеды і князя Уладзіміра на фоне міжусобіц. Можа, таму так моцна і зачапіла. З аднаго боку хацелася потым заглыбіцца ў гісторыю, супастаўляючы вядомыя гістарычныя факты з тым, што паказваецца на сцэне. А з другога — дазваляла зразумець: гэта мастацтва, у яго свае падыходы да працы з гістарычным матэрыялам, свой погляд і свае важныя асветныя задачы (з якімі «Палачанка», пастаўленая ўпершыню ў ТЮГу больш за дваццаць гадоў таму, справілася). А цяпер яна вярнулася на сцэну гэтага ж тэатра ў новым абліччы — праз працу рэжысёра Таццяны Самбук. Праўда, з прысвячэннямі...

— Ідэя пастаноўкі нарадзілася ў памяць пра Андрэя Андросіка, колішняга мастацкага кіраўніка гэтага тэатра і рэжысёра-пастаноўшчыка «Палачанкі», якая некалі была візітоўкай тэатра, — патлумачыла **дырэктар Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага тэатра юнага гледача заслужаная артыстка краіны Вера Палякова-МАКЕЙ**. — Гэта быў адзін з самых гучных спектакляў, які прагрымеў на ўсю Беларусь. Я падумала, што было б вельмі правільна і важна зрабіць так, каб гэты спектакль зноў ажыў на сцэне Тэатра юнага гледача, і прысвяціць яго памяці Андрэя Андросіка. Але ў хуткім часе, на жаль, сышоў з жыцця АляксейАнуфрыевіч Дударaў, якога я добра ведала. Я падумала, што цяпер дакладна трэба паставіць спектакль паводле п'есы Дударава і прысвяціць яго двум выдатным асобам, якія зрабілі вялікі ўнёсак у развіццё беларускага тэатральнага мастацтва. Мне здаецца, што нам удалося стварыць нешта новае, але ў той жа час захаваць цудоўны тэкст і добрыя традыцыі, якія існавалі ў ТЮГу. П'еса мела некаторыя скарачэнні, Таццяна Самбук напісала аўтарскую інсцэніроўку. І дадала свайго бачання, як яна як сучасны малады чалавек адчувае гістарычную драму ў сучасных рэаліях. Мы цалкам прыбралі ўсю ваяўнічую частку гэтага твора, пакінулі выключна лінію драматычнага кахання двух вядомых нам персанажаў — мне здаецца, што гісторыю Рагнеды і Уладзіміра, як і Рагвалода, павінен ведаць кожны беларус, які сябе паважае.

«Не хачу разуці рабыціча», — фраза Рагнеды пры сватаўстве наўгародскага князя Уладзіміра, якую захавалі ў вяках гістарычныя дакументы. Адмова гордай дзяўчыны, дачкі князя Рагвалода, што абярнулася жорсткай помстай прынажанага «жаніха», знішчэннем Полацка і сям'і самой Рагнеды. Але што магло адбывацца раней? Чаму менавіта да Рагнеды сын кіеўскага князя Святаслава і рабыні Малушы вырашыў засылаць сватоў? Чаму так упарта яе дабіваўся і не знішчыў разам з сям'ёй за абразу, але адпомсціў своеасаблівым чынам: узяў за жонку?.. Варыянт аўтара п'есы Аляксея Дударава арыгінальны і вельмі рамантычны: яны пазнаёміліся раней, пакахалі адно аднаго, але менавіта Рагвалод хацеў аддаць дачку за кіеўскага князя Яраполка, пасланнік якога раскрыў праўду пра нараджэнне Уладзіміра. Вось гэтая частка п'есы і ўвасоблена ў новай пастаноўцы. Рэжысёр Таццяна Самбук, на думку дырэктара тэатра, як ніхто іншы, адчувае, як трэба ставіць пра каханне для маладой аўдыторыі (узроставая мяжа 16+), таму працаваць з гэтым матэрыялам без ваганняў прапанавалі менавіта ёй (але ўсе тэкставыя змены былі ўзгодненыя з удавой аўтара, якая з'яўляецца яго правапераемніцай і прысутнічала на прэм'еры).

І так, мы глядзім спектакль пра каханне. Якое па-за часам (на гэта працуе мінімалістычнае афармленне сцэны мастака-пастаноўшчыка Ларысы Рулёвай, калі сюжэт разгортваецца на чорным фоне, які дыхае, і толькі асобныя героі ці вопратка альбо дэталі маюць пэўны колер у залежнасці ад сітуацыі). Якое можа быць несвоечасовым (дзядзька Уладзіміра мае стратэгічныя планы і не вельмі радуецца таму, што наўгародскі князь шукае нейкую простую дзяўчыну, якую сустрэў у лесе). Якое часам развіваецца насуперак (Рагнеда чакае сватоў ад яго, а не ад Яраполка, як хоча бацька, і той замест дачкі паказвае сватам дзяўчыну Любаву, якая вымушана абразліва адхіліць прапанову). І ў якім часавае размежаванне таксама мае значэнне: ёсць дзень і ноч, як ёсць надзея і яе руйнаванне — у абодвух закаханых, але ў кожнага гэта адбываецца па-свойму. Уладзімір раз'юшаны адмовай дзяўчыны. Рагнеда шакаваная яго жорсткай помстай. На прэм'еры акцёры Маргарыта Кіселютэ і Генадзь Гаранскі стараліся ўвасобіць эмацыйныя ўзлёты і падзенні герояў. А маўклівым сведкам усіх гэтых сюжэтных паваротаў становіцца персанаж, якога не было ў п'есе Дударава, але рэжысёр-пастаноўшчык Таццяна Самбук увяла яго сама: гэта Ярыла (да яго звяртаецца Рагнеда), бог вясны і пачуццёвага кахання. Але на сцэне ён у вобразе Сонца — з адпаведным арэолам залацістых промняў. Ён становіцца сведкам размоў і стасункаў герояў. Ён то з'яўляецца, то знікае — як быццам асвятляе жыццё ў нейкія моманты, ці сыходзіць у цень, калі сітуацыя мяняецца. Ці наогул гіне — ад рукі Уладзіміра. І гэта павінна быць сімвалічна: гіне бог-сонца, таму што з'яўляецца Уладзімір Красна Сонейка — менавіта так у народзе называлі кіеўскага князя, які замясціў паганства хрысціянствам. Але да таго яшчэ далёка, а Рагнеда і Полацк — пачатак яго шляху да ўладарства.

Таццяна Самбук прызнавалася, што ў адрозненне ад папярэдніх пастановак, дзе яна больш эксперыментавала з формай, гэтая больш класічная. Не ў малой ступені так атрымалася з-за таго, што яна адчувала сваю адказнасць за матэрыял, з якім пазнаёмілася ўпершыню, таму што яна расіянка па паходжанні і ўвесь час імкнулася звяртацца па дапамогу, каб лепей разумець: ці дакладна акцёры прамаўляюць тэкст, ці правільную эмоцыю выяўляюць. Але яна падкрэсліла, што ў гэтай пастаноўцы для яе як ніколі была важна камандная работа. У яе спектаклях звычайна шмат музыкі. Тут яна таксама ёсць, але на гэты раз артысты на сцэне самі не спяваюць, песні ідуць фонам — напрыклад, народная «Рэчанька», а яшчэ гучыць аўтарская песня Антона Смаленскага ў яго ж выкананні. І асобнай важнай часткай працы рэжысёр лічыць пластычныя моманты, за якія адказваў Кірыл Балтрукоў, супрацоўнік Маладзёжнага тэатра, але ён далучыўся да пастаноўкі. Наколькі ўсё разам спрацавала і які вынік дало — пакажа рэакцыя саміх юных гледачоў. Таму што ім дазволена абсалютна адкрыта, не хаваючыся, карыстацца падчас прагляду мабільнымі тэлефонамі, рабіць здымкі і выстаўляць іх у свае сацыяльныя сеткі з выказваннем уласных меркаванняў. Да гэтага перад пачаткам спектаклю нават заклікае гледачоў асабіста кіраўнік тэатра. Што праўда, то «карцінка», як кажуць, будзе эфектная, «інстаграмная». Пры тым ніхто не забараняе прыходзіць на спектакль і больш сталым гледачам, як гэта было і ў выпадку першай пастаноўкі «Палачанкі» ў ТЮГу — як ні круці, але памяць пра той спектакль жывая, як і жывая памяць пра яго стваральнікаў. Нездарма перад прэм'ерай для гледачоў наладзілі своеасаблівы «Вечар памяці Аляксея Дударава» — для кагосьці гэта сапраўды знаёмства з драматургам, які шмат п'ес прысвяціў беларускай гісторыі.

Ларыса ЦІМОШЫК.

Усходні гараскоп на наступны тыдзень

АВЕН. Карысна будзе заняцца пашырэннем круга зносін, тым больш што магчымасць завесці новыя цікавыя знаёмствы, напэўна, з'явіцца. У аўторак зможаце праявіць сябе ў многіх абласцях, у першую чаргу ў прафесійнай. Выконваючы працу, важна не спяшацца, рабіць усё максімальна старанна і акуратна. У чацвер увагі запатрабуе асабістая сфера.

ЦЯЛЕЦ. Паспрабуйце быць больш уважлівымі, не дапускаць памылак, каб калегі не абвінавацілі вас у абыякавасці да агульнай справы. У сераду будзеце думаць на рэдкасць ясна, што стане садзейнічаць зараджэнню мноства ідэй, якія пажадана падзяліць на рэальныя і ілюзорныя. У гэты дзень будуць удалымі паездкі і падарожжы. Вам неабходныя надзейнасць і дзелавая хватка, якія дазваляюць паспяхова супрацьстаяць апанентам у любой сітуацыі. Нядзеля можа парадаваць прыемнымі падзеямі ў сям'і.

БЛІЗНЯТЫ. Жыццё будзе поўнае разнастайных фарбаў. Работа прынясе задавальненне і прыбытак. Асабістае жыццё парадуе рамантыкай і ўзаемнымі пачуццямі. Вы адчуеце прыліў сіл, здароўе палепшыцца. Вам могуць спатрэбіцца творчая імправізацыя, пунктуальнасць і сабранасць, а поспех са спадарыняй Фартунай не абыдуць вас бокам.

РАК. Вас можа чакаць шмат важных спраў і цікавых знаёмстваў. Нейкія з іх акажуцца лёсавызначальнымі. Верагодна, новыя людзі могуць адыграць істотную ролю ва ўладкаванні вашай кар'еры, рэалізацыі вашых ідэй. Сітуацыя, магчыма, запатрабуе высокай працаздольнасці. Паспрабуйце менш гаварыць і больш слухаць. Не імкніцеся ў канцы тыдня ўсё паставіць з ног на галаву, гэтыя раптоўныя пераўтварэнні могуць выклікаць здзіўленне ў калег. У выхадныя збярыце сяброў.

ЛЕЎ. На гэтым тыдні новыя справы, праекты і прапановы будуць не ў час. Вы яшчэ не разабраліся з ранейшымі задачамі. Пакуль нязручны момант для канструктыўных перамен. У канцы тыдня з'явіцца магчымасць павысіць свой сацыяльны статус. У выхадныя не трэба прымаць важнае рашэнне ў адзіночку. Варта прааналізаваць адносіны з навакольнымі. Калі ўсё выглядае не так, як вам таго б хацелася, забудзьце старыя крыўды і падумайце пра новыя сумесныя справы.

ДЗЕВА. На гэтым тыдні вы будзеце схільныя рабіць з мухі слана. Глядзіце, як бы гэта не стала праблемай. У высакародным парыве зрабіць жыццё найлепшым вы рызыкуеце забыцца пра паўсядзённую руціну, якая не праміне нагадаць пра сябе самым непрыемным чынам. Сябры могуць падвесці вас, але не варта на іх злавацца, бываюць розныя акалічнасці.

ШАЛІ. Тыдзень удалы ў плане працы і фінансаў, вам толькі застаецца згладзіць у сітуацыі некаторыя шурпатасці. Паспрабуйце максімальна выкарыстоўваць вашыя творчыя здольнасці. Толькі не вельмі цягніце коўдру на сябе. Можаце разлічваць на дапамогу сяброў ва ўладкаванні асабістага жыцця. У выхадныя пастарайцеся не адмаўляць просьбам сваякоў.

СКАРПІЁН. На гэтым тыдні, магчыма, вас запросяць удзельнічаць у шматабяцальным праекце, варта чакаць добры прыбытак. У аўторак і сераду лепш не плануйце сур'ёзных мерапрыемстваў, затое ў другой палове тыдня практычна ўсе справы будуць удавацца з лёгкасцю. Суботнія поспехі могуць натхніць вас. У нядзелю любоўнае спатканне будзе асабліва гарачым.

СТРАЛЕЦ. На гэтым тыдні вам будзе нялішне падсумаваць тое, што пражыта, і адкрыць для сябе новую старонку, запаўненне якой варта пачаць з актыўнага засваення атрыманага досведу. Паспрабуйце не прабалбатацца аб тым патаемным, што ў вас на душы, — адны могуць не зразумець, а іншыя пазайздросцяць. Пятніца — адзін з самых цудоўных дзён тыдня. Больш пазітыву. Усміхайцеся з самай раніцы і паспрабуйце ні з кім не сварыцца.

КАЗЯРОГ. Гэты тыдзень — добры перыяд для абдумвання і абмеркавання доўгатэрміновых планаў. У гэтай нялёгкай справе вам дапаможа інтуіцыя. У аўторак нічога не адкладайце на заўтра, не прапускайце спрыяльнага моманту. У сярэдзіне тыдня магчымыя сумоўі ці проста размовы з начальствам. Пастарайцеся не даваць волю языку і старанна абдумваць кожнае сваё слова. У суботу на вашым парозе могуць з'явіцца нечаканыя госці.

ВАДАЛІЙ. На гэтым тыдні зможаце станоўча зарэкамендаваць сябе ў новым калектыве, ярка і арыгінальна праявіць у сяброўскай кампаніі. Да пачатку найбліжэйшых выхадных дзён варта забыцца пра паездкі і падарожжы, лепш разграбіце назапашаныя праблемы. У сераду пастарайцеся пазбегнуць паспешных і неразважлівых рашэнняў як у дзелавых пытаннях, так і ў праблемах асабістага характару. У суботу выявіце пэўную паблажлівасць да дзяцей і старэйшых сваякоў, з першага разу ў вас наўрад ці атрымаецца дамагчыся іх разумення.

РЫБЫ. На гэтым тыдні ваша энергія будзе здзіўляць навакольных. У панядзелак ваша хвалёная інтуіцыя павінна падказаць, дзе хаваецца ключ ад практычна нявырашанай праблемы. Аўторак і сераду вы праведзяце ў пошуках патрэбнай творчай думкі і атрымаеце поспех у гэтым. У выхадныя не вельмі расслабляйцеся, лёс знойдзе спосаб вас здзівіць. Не варта прымаць блізка да сэрца чужое меркаванне і плёткі.

16 ЛІСТАПАДА — Даты — Падзеі — Людзі

У краіне

1812 год — разгром арміі Напалеона на Беразіне каля в. Студзёнка (цяпер — Барысаўскі раён) у час пераправы французскай арміі. Пакінула моцны адбітак у грамадскай свядомасці французаў, якія да гэтага часу ўжываюць слова «Бярэзіна» (фр. Berezina або berezina) як метафару поўнага правалу або катастрофы.

1914 год — нарадзіўся (в. Пятровічы Ігуменскага павета) Язэп Семяжон, беларускі пісьменнік і перакладчык. Лаўрэат дзяржаўнай прэміі БССР. У яго перакладзе выйшлі «Кароль Лір» У. Шэкспіра, кніжка паэзіі Дж. Радары «Неапаль без сонца», Р. Бёрнса «Шатландская слава», раман М. Твена «Жанна д'Арк», паэма беларускага паэта-лацініста М. Гусоўскага «Песня пра зубра», кніга выбраных перакладаў паэзіі «Сем цудаў свету», паэма А. Міцкевіча «Пан Тадэвуш» і іншае.

1953 год — нарадзіўся (г. Бабруйск) Аляксандр Пракапенка, выдатны беларускі футбаліст, паўабаронца, чэмпіён Савецкага Саюза ў складзе каманды майстроў мінскага «Дынама», бронзавы прызёр Алімпіяды 1980 года.

У свеце

42 год да н. э. — нарадзіўся Тыберый, рымскі імператар. Згадваецца ў Евангеллі ад Лукі пад імем Тыберыя кесара (Лк. 3:1) як імператар, на час кіравання якога прыпадае пачатак пропаведзі Ісуса Хрыста. Па ўскосных даных, на яго кіраванне прыпадае і распяцце Хрыста. У праваслаўнай традыцыі вядома паданне аб сустрэчы Тыберыя і Марыі Магдаліны, і з гэтай сустрэчай звязваюць звычай дарыць велікодныя яйкі. Спачатку яйка, падоранае Марыяй Магдалінай Тыберыю, было зусім звычайным, і імператар, усумніўшыся ў дзіўнай вестцы аб уваскрашэнні Хрыста, сказаў, што як яйка не можа з белага стаць чырвоным, так і мёртвыя не ўваскрасаюць. І ў той жа момант яйка пачырванела ў яго на вачах.

1632 год — адбылася бітва пад Лютцэнам, найвялікшая ў Трыццацігадовую вайну. На полі бою сышліся шведскае войска на чале з каралём Густавам II Адольфам і войскі Каталіцкай лігі, што былі пад камандаваннем Альбрэхта Валенштэйна. Шведскі кароль загінуў на полі бою, аднак яго армія перамагла падчас бітвы.

1933 год — устанаўленне дыпламатычных адносін паміж СССР і ЗША.

Так гаварыў...

НАГАРДЖУНА:

«Нават калі вы будзеце забіваць усё жыццё, то не знішчыце ўсіх сваіх нядобразычліўцаў. Але ж калі вы справіцеся са сваім гневам, вы заб'яце сапраўднага ворага».

Супрацоўнікі Выдавецкага дома «Звязда» выказваюць шчырыя спачуванні загадчыку аддзела рэкламнай дзейнасці Гецэвіч Вользе Андрэеўне з нагоды напаткаўшага яе вялікага гора — смерці МУЖА.

Навінкі кнігавыдання

КАЛІ ЗА ЛЕТА НЕ ЎБАЧУ ЖЫТА...

У «Мастацкай літаратуры» выйшла кніга народнага паэта

Для ўсіх аматараў беларускай паэзіі знакавымі з'яўляюцца імя і творчасць народнага паэта Беларусі Пімена Панчанкі (1917—1995). Новае выданне яго найлепшых твораў пабачыла свет у серыі «Новая бібліятэка беларускай паэзіі» выдавецтва «Мастацкая літаратура».

«Калі за лета не ўбачу жыта — // Зраблюся хворым. // А за плячыма ўсё пяражытае // Стаіць з дакорам. // І тыя сцежкі, і тыя межы, // Даўно ўзараныя; // А даль нябёсаў, як і належа, // У сінь прыбраная. // Дубоў вялікасць, // Бярозаў светласць // Ў зялёным дыме. // І свет адметны, // І час прыкметны: // Мы — маладыя...» Гэтыя радкі — з верша Пімена Панчанкі «Жытнёвы звон», які быў напісаны яркім мастаком слова, паэтам-мудрацом незадоўга да смерці. Гэтым вершам і завяршаецца кніга «Вяртанне», укладзеная Алесем Бадаком — чулым чытачом і выдатным сучасным беларускім паэтам.

Укладальнік зборніка выбраў найлепшае, што напісана Панчанкам амаль за шэсць дзесяцігоддзяў творчай працы. Значнае месца ў кнізе займаюць творы, якія былі напісаны ў час Вялікай Айчыннай вайны альбо створаныя ў іншыя дзесяцігоддзі і прысвечаныя ваеннай тэме («Беларусі», «Дарога вайны», «Краіна мая», «Падбіты танк», «Дзеці вайны», «Франтавік»). Пімен Панчанка — паэт франтавога пакалення, сам прайшоў ваеннымі сцежкамі, зведаў і дарогі ў Іранскім паходзе. Свае пачуцці аб драматычных падзеях, аб пакутлівых выпрабаваннях, аб стратах беларускага народа ў змаганні з фашысцкімі захопнікамі паэт пранёс праз усё жыццё... І трывалаасці ў асэнсаванні падзей мінулага тонкаму лірыку і выразна грамадзянскаму мастаку слова дадавала яго захопленасць сваёй Айчынай, улюбёнасць у родныя прасторы, мастацкая адказнасць за час і за сваё пакаленне ў гэтым часе...

«Добра ведаюць усе з маленства, // Што паэтаў нараджаюць пад Смаленскам, // Ля падножжа Арарата і ў Сібіры, // І на землях Руставелі і Сабіра, // Над Дняпром, дзе нешта п'юць з пякучым перцам, // І на Балтыцы, дзе людзі з мужным сэрцам. // Часам іх знаходзяць у Разані, // А яшчэ жывуць паэты ў Дагестане... <...> Дзе ж той край залатакосы, край зялёны — // Рык ласіны,/ звон пчаліны, // Мора лёну? // Там, дзе Свіцязь, там, дзе Прыпяць і Ясельда, // Дзе танцуюць пад цымбалы на вяселлях; // Дзе жанчына, сінявокая і ласкавая, // Звонка чаравічкамі пляскала» («Край паэтаў»).

Кнігу «Вяртанне» Пімена Панчанкі, які пры жыцці выдаў дзясяткі зборнікаў з прыгожымі, жывымі па сваім гучанні, па сваёй шчырасці назвамі («Шырокі свет», «Тысяча небасхілаў», «Пры святле маланак», «Снежань», «Крык сойкі», «Млечны шлях», «Маўклівая малітва», «Лясныя воблакі», «Зямля ў мяне адна»), можна набыць ва ўсіх кнігарнях ААТ «Белкніга» па ўсёй краіне і ў кнігарні «Акадэмкніга» ў горадзе Мінску па адрасе: праспект Незалежнасці, 72.

Паэтычнага ўсім настрою і добрых урокаў жывога, роднага мастацкага слова!

Кастусь ХАДЫКА.

УСМІХНЕМСЯ

Дарослае жыццё — гэта, па сутнасці, вечная спроба заснуць ноччу і не заснуць днём.

— Дзяўчына, што ж вы так, я ж не кожнай прапаную...

— Ды вы супакойцеся, я ж таксама не ўсім адмаўляю...

Каты і мужчыны так падобныя. Калі яны раптам становяцца ласкавымі, значыць, ім ад вас нешта трэба ці ж яны ўжо недзе нагадзілі.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	8.39	17.09	8.30
Віцебск —	8.34	16.53	8.19
Магілёў —	8.29	16.59	8.30
Гомель —	8.20	17.02	8.42
Гродна —	8.54	17.25	8.31
Брэст —	8.48	17.32	8.44

Месяц

Поўня ў 0.28.

Месяц у сузор'і Блізнят.

Імяніны

Пр. *Еўдакій, Аляксандра, Вікенція, Георгія, Іосіфа, Мікалая.*
К. *Гертруды, Марка.*

Фота Лізаветы ГОЛАД.

ЗАЎТРА



ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

www.zviazda.by
e-mail: info@zviazda.by
для зваротаў: zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, праспект Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 10.785. Індэкс 63850. Зак. № 2611.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 15 лістапада 2024 года.